Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

13 ЛЮТАГА 2018 г. АЎТОРАК № 30 (28646)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Крэм, дэсерт і кактэйль... з бульбы**

СТАР. 9



**Парады для штогадовага яблычнага ўраджаю**

СТАР. 11



**«Міс Беларусь»: прыгожая, разумная, годная**

СТАР. 12

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Уладзімір КРАЎЦОЎ, старшыня Гродзенскага аблвыканкама:**

*«Эканоміка Гродзенскай вобласці за мінулы год прадэманстравала станоўчую дынаміку. Прырост ёсць па ўсіх асноўных галінах: і ў прамысловасці, і ў аграрным сектары, і ў будаўнічым комплексе. Выкананы ўсе асноўныя ключавыя параметры эфектыўнасці работы выканаўчай улады. Аб'ём валавога рэгіянальнага прадукту ў 2017 годзе склаў 102,6 % да ўзроўню 2016 года. Упэўнена працагваецца рэалізацыя самага буйнога на тэрыторыі вобласці праекта па будаўніцтве Беларускай АЭС у Астравецкім раёне. Дынамічна развіваецца і горад атамшчыкаў Астравец. Буйныя праекты ў сферы прамысловасці рэалізуюцца ў Гродне, у прыватнасці ў ААТ «Гродна Азот», а таксама ў іншых раёнах вобласці».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 13.02.2018 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9959 | ▼ |
| Еўра | 2,4499 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0344 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0743 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

18030

# Надзейная падтрымка



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Мінчанін Аляксандр ШЧАРБІНСКІ вучыць стаяць на каньках унучку Паліну і яе сяброўку Ганну ЗУБОК на лёдзе ў Лошыцкім парку.

■ Разумныя грошы

## СЕМ РАЗОЎ ПРАЧЫТАЙ, АДЗІН — ПАДПІШЫ

**У крэдытным дагаворы трэба чытаць усе пункты і нават тое, што напісана паміж радкоў**

**Некалькі гадоў таму мой даўні сябар вырашыў зрабіць рэканструкцыю сваёй дачы пад Мінскам. Каб узяць не вельмі дарагі крэдыт на гэтыя мэты, звярнуўся ў банк. Для атрымання такога крэдыту, тэрмінам на 10 гадоў, яму спатрэбілася сабраць цэлую «торбу» дакументаў з працы, мясцовага выканкама, а таксама адшукаць некалькіх паручыцеляў.**

**Усё было добра, але на фінішы будоўлі ўласніку загараднай нерухомасці не хапіла некалькі мільёнаў старых яшчэ рублёў. Сума, вядома, не вельмі вялікая, аднак... Грошы ў банку яму тады далі, пад спажывецкі крэдыт, але там нешта было дробненька надрукавана. Ён нават тады і не чытаў тое... А варта было. Бо там напісана, што дагавор мае таксама на ўвазе аказанне банкаўскіх паслуг, вядома ж, не бясплатных. Сябру яны і не патрэбныя былі, але добрую капейку за іх заплаціць давялося.**

### У барацьбе за спажыўца

Цяпер сітуацыя складваецца інакш. Айчынныя банкі пры спажывецкім крэдытаванні кіруюцца рэкамендацыямі Нацбанка. Гэта дапамагае пазбегнуць выпадкаў, падобных таму, з якім сутыкнуўся мой сябар, — калі некаторыя банкі дзеля забеспячэння рэнтабельнасці спажывецкага крэдытавання ўвязвалі выдачу крэдытаў з афармленнем кліентамі так званых пакетаў паслуг, цана абслугоўвання якіх была сувмяшчальная з коштам абвешчанай працэнтнай стаўкі па крэдыце.

СТАР. 7

■ Асоба

## СЭРЦА БІЛАСЯ ДЛЯ ЛЮДЗЕЙ

**Сёння спаўняецца 100 гадоў з дня нараджэння Пятра Міронавіча Машэрава**

**Выдатны дзеяч савецкай эпохі, які шмат чаго зрабіў для роднай Беларусі, з'явіўся на свет у вёсцы Шыркі Сенненскага павета Магілёўскай губерні (цяперашняя Віцебшчына). Сын селяніна-бедняка, ён з дзяцінства ведаў цану хлеба. Невыпадкова, узначаліўшы ў сакавіку 1965 года Камуністычную партыю Беларусі, з першых дзён прыслухоўваўся да інтарэсаў народа.**

СТАР. 4



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

У час мантажу інсталяцыі рабочага кабінета Пятра Міронавіча Машэрава.

■ Парламенцкі дзённік

# Дакументы ў пакеце

## Як рабіць законы больш эфектыўнымі, разбіраліся ў парламенце

**На семінары ў авальнай зале Дома ўрада сабраліся прадстаўнікі абедзвюх палат, Міністэрства юстыцыі, Адміністрацыі Прэзідэнта, Канстытуцыйнага Суда і іншых дзяржаўных устаноў. Яны абмеркавалі плюсы і мінусы ўвядзення пакетнага прынцыпу падрыхтоўкі праектаў нарматыўных прававых актаў. Станоўчага, здаецца, больш, але калі выкарыстоўваць такі падыход там, дзе ён сапраўды патрэбны.**

**Ала БОДАК, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве,** тлумачыць, што «калі з асноўным дакументам адначасова рыхтуецца і ўвесь астатні пакет актаў, які забяспечвае механізм (дапусцім, сёння ва ўказе прадугледжваецца адсылачныя нормы аб тым, што парадак рэгламентуецца альбо пастановай урада, альбо ведамасным актам, то адначасова рыхтуюцца ўсе гэтыя акты) — гэта і ёсць так званы пакет».

Абмеркаванне праходзіць падчас падрыхтоўкі да разгляду ў другім чытанні новай рэдакцыі Закона «Аб нарматыўных прававых актах Рэспублікі Беларусь». У ім пакетны прынцып плануецца распаўсюдзіць на больш шырокае кола актаў заканадаўства. Дарэчы, зараз, паводле звестак Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі, штомесячна прымаецца каля 800 прававых актаў.

Пакетны прынцып — не навінка, ён прапаноўваўся яшчэ ў Канцэпцыі ўдасканалення заканадаўства, якая была прынятая ў 2002 годзе. Хоць у існуючай рэдакцыі Закона «Аб нарматыўных прававых актах Рэспублікі Беларусь» няма прамога ўказання на падрыхтоўку па пакетным прынцыпе. Але ў ёй замацаваны сістэмнасць і комплекснасць прававога рэгулявання грамадскіх адносін, што па факце цесна звязана з прынцыпам пакета. На гэта звярнуў увагу **міністр юстыцыі Беларусі Алег СЛІЖЭЎСКІ**. Ён лічыць, што «хоць па зразумелых прычынах прымяненне пакетнага прынцыпу падрыхтоўкі праектаў не заўсёды магчымае, але тым не менш неабходнасць пашырэння яго ўжывання прадыктавана практыкай».

**Начальнік галоўнага дзяржаўна-прававога ўпраўлення Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Андрэй МАЦЕЛЬСКІ** адзначае, што цалкам адмовіцца ад адсылачных нормаў нельга. Пры гэтым заканадаўцу важна знайсці баланс, пры якім усё важнае рэалізавана ў законе, а колькасць падзаконных актаў мінімальная. Але нярэдка падзаконныя акты прымаюцца з вялікім спазненнем. Напрыклад, у маі мінулага года ў сілу ўступілі змяненні і дапаўненні Закона «Аб ветэрынарнай дзейнасці», але больш за 40 актаў не былі прыведзены ў адпаведнасць...

**Надзея АНІСОВІЧ**

■ Медыяпрастора

# КАБ НЕ ТРАПІЦЬ У «СЕТКУ»

## Палова зваротаў грамадзян на адрас Міністэрства інфармацыі датычыцца работы інтэрнэт-парталаў і сацыяльных сетак

**У апошні час рэзка ўзрасла колькасць просьбаў, патрабаванняў, скаргаў, крытычных выпадаў, якія паступаюць ад грамадзян на адрас Міністэрства інфармацыі ў сувязі з дзейнасцю вэб-сайтаў і таго, што адбываецца ў інтэрнэт-сетках. Людзі апелююць да нас як да аўтарытэтнага дзяржаўнага органа, закліканага «навесці парадак» у інтэрнэт-прасторы. Пры гэтым часта перабольшваючы магчымасці дзяржавы ў гэтай сферы.**

Сярод зваротаў усё часцей чуваць заклікі «пакараць», «спыніць», «засцерагчы». І мала хто з абураных «бяздзейнасцю чыноўнікаў» задумваецца, што адказныя асобы пастаўленыя ў жорсткія рамкі заканадаўства, таму шмат у чым абмежаваныя.

Штогод Міністэрства інфармацыі атрымлівае каля 400 лістоў і паведамленняў рознага кшталту, не лічачы ананімных. Намі праведзены іх пільны аналіз. Для гэтага была адабрана ўся пошта, якая прыйшла з верасня 2017-га па студзень 2018 года. З 86 зваротаў, якія паступілі за гэты перыяд, амаль палова датычыцца работы інтэрнэт-сайтаў і сацыяльных сетак.

Вялікая колькасць зваротаў прасякнута трывогай за дзяцей, якія, заходзячы нават на самы бяскрыўдны сайт, у любы момант могуць убачыць на ім спасылку на жорсткае відэа ці так званую сексуальную «клубнічку» і без абмежаванняў па гэтай спасылцы перайсці на партал зусім не для дзіцячых вачэй. «Чаму, — чытаем у адным з допісаў, — нас штодня засяроджваюць на сексе, забойствах, крушэннях, аварыях? Колькі мы будзем цярпець увесь гэты інфармацыйны бруд?»

Тыя ж матывы ў лісце жыхара Фаніпаля, абуранага гламурным артыкулам на адным з парталаў пра парачку беларускіх геяў, якія пасяліліся ў Швецыі. «Не дай бог, — піша ён, — мне дажыць да наступстваў Садома і Гаморы. Наогул што-небудзь робіцца ў дзяржаўных службах, каб гэты бруд не вылазіў з усіх шчылін? Дзе закон? За сябе я не баюся. А мае дзеці? Ці не вы іх павінны абараніць ад гэтага патоку?»

Ліст падобнага роду, у якіх людзі абураюцца з нагоды прапаганды ў інтэрнэце распусты, гвалту і жорсткасці, — пятая частка ад агульнай колькасці тых, што прыходзяць у міністэрства.

Але гэтая лічба вельмі ўмоўная. Паколькі тыя ж тэмы падымаюцца, калі гаворка заходзіць пра іншыя негатыўныя бакі інтэрнэт-прасторы. Напрыклад, аб паводзінах удзельнікаў шматлікіх форумаў. Гнеўных пасланняў наконт гэтага таксама нямала. На думку іх аўтараў, на форумах пануе поўнае бязмежжа. Людзі, якія ўступаюць адзін з адным у слоўныя баталіі, часам выходзяць за рамкі ўсякіх прыстойнасцяў. Не дзіўна, што пасля гэтага мы атрымліваем восць такія лісты. «Прашу Міністэрства інфармацыі прыняць меры па недапушчэнні або абмежаванні магчымасці напісання каментарыя пад навінамі... Публікацыя нецэнзурных выразаў і прававаецыйных каментарыяў спрые маральнаму распаду чытачоў, а таксама шакіруе непадрыхтаваных людзей. Свабода слова павінна заўсёды ісці паралельна з адказнасцю. Часта недапушчальныя з пункту гледжання маральнасці каментарыі займаюць топ-пазіцыі. Нават калі выказаць здагадку, што з пункту гледжання сённяшніх законаў і прававых нормаў такое дапушчальна, то з пункту гледжання чалавечнасці і культурных нормаў — адназначна не. Прашу разгледзець строгія меры ў дачыненні да сайта аж да поўнай забароны на публікацыю навін, пакуль ва ўладальнікаў партала не прыйдзе разуменне адказнасці за тое, што яны публікуюць і якія каментарыі дапускаюць», — піша наш карэспандэнт з Мінска.

Абмяркоўваючы стылістыку ўдзельнікаў форумаў, аўтары адрасаваных нам лістоў амаль заўсёды з трывогай адзначаюць, што падчас гэтых дыскусій, акрамя іншага, абражаюцца нацыянальныя і рэлігійныя пачуцці грамадзян. А гэта, як падкрэсліваецца ў паведамленнях, пагражае распальваннем міжэтнічных і нават міждзяржаўных канфліктаў. З асаблівай вастрынёй гэтая тэма прагучала ў лісце з Гродна: «...пяшчотна апякуемае кімсьці інтэрнэт-выданне рэгулярна і беспакарана ажыццяўляе антыдзяржаўную дзейнасць, распальваючы нянавісць, сеючы разлад і варожасць паміж грамадзянамі Беларусі і Расіі. Люстрацыйныя камітэты, якія працуюць на Украіне, як бы намякаюць пра тое, што падлашчванне ўлады да нацыяналістаў заўсёды дрэнна заканчваецца. Для ўлады, як правіла. І для дзяржавы».

Пытанні выклікае і законнасць дзеянняў некаторых парталаў. Уладальнікі сайтаў, мяркуючы па некаторых допісах, нярэдка пускаюцца ў шантаж. Напрыклад, выбіраюць нейкую фірму і пачынаюць з дапамогай публікацый негатыўных каментарыяў наносіць шкоду яе рэпутацыі. А каб спыніць гэты вал «кампрамату», прызначаюць адкупную цану. Дырэктар мінскай будаўнічай кампаніі паведаміў у сваёй электроннай карэспандэнцыі, што з яго за такую «паслугу» патрабавалі каля 100 тысяч рублёў.

Не грэбуюць адміністратары сайтаў, як вынікае са скаргаў, таксама распаўсюджваннем фота, відэа, тэлефонных размоў прыватных асоб без іх згоды. Абураныя лісты аб умяшанні ва ўласнае жыццё грамадзян з боку ўладальнікаў інтэрнэт-рэсурсаў складаюць значную долю электроннай пошты. Прэтэнзіі, здараецца, пераходзяць і ў плоскасць аўтарскага права, — калі літаратурны ці мастацкі твор змяшчаецца на інтэрнэт-старонцы без ўзгаднення з аўтарам. Напрыклад, член Саюза пісьменнікаў Беларусі абураецца: «Некалькі разоў я на старонках пэўных сайтаў пісаў, каб іх адміністратары знялі мае творы, але яны да мяне не прыслухаліся, выніку так і не дабіўся. Увогуле, кантактаў з адміністратарамі сайтаў знайсці немагчыма... Хто яны, піраты? Прашу вас прыняць меры, каб мае аповесці, апавяданні і казкі былі выдалены з указаных сайтаў, паколькі іх адміністратары груба парушаюць мае аўтарскія правы...»

Характэрна, што адзін з тых, хто звярнуўся па тлумачэнні ў міністэрства, — уладальнік сайта. Яшчэ адзін чалавек піша, што жадае стварыць уласны YouTube-канал. Няма сумненняў, што такая дзейнасць будзе станавіцца ўсё больш прывабнай, асабліва для маладога пакалення. І дзяржаве давядзецца прыкласці нямала намаганняў, каб рэгуляваць звязаныя з гэтым працэсы.

У цэлым жа праведзены аналіз электронных зваротаў грамадзян сведчыць пра тое, што насельніцтва працягвае імкліва паглыбляцца ў інтэрнэт-прастору. З аднаго боку, гэта паказчык сучаснага развіцця грамадства. З другога — такі круты паварот у свядомасці людзей, вобразе іх мыслення і жыцця прымушае задумацца: ці не стане гэты віртуальны свет некіраваным. Занадта яскрава праяўляюцца многія негатыўныя тэндэнцыі, уласцівыя менавіта інтэрнэт-прасторы. Відавочна, што насіпае неабходнасць рабіць крокі на заканадаўчым узроўні, каб гэтыя тэндэнцыі нівеляваць або папярэдзіць. У адваротным выпадку мы рызыкуем патануць у брудзе і супрацьпраўным бязмежжы вэб-сайтаў і сацыяльных сетак і, што самае страшнае, — згубіць там сваіх дзяцей.

**Мікалай МІХАЙЛАЎ**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### ГРАМАДЗЯН БЕЛАРУСІ СЯРОД АХВЯР КАТАСТРОФЫ САМАЛЁТА Ў ПАДМАСКОЎІ НЯМА

Аб гэтым паведамілі ў пасольстве Беларусі ў Расіі. Гэтую ж інфармацыю беларускаму дыппрадстаўніцтву пацвердзілі ў кампаніі, якая абслугоўвае «Саратаўскія авіяліні» ў аэрапорце Дамадзедава. Катастрофа самалёта Ан-148 адбылася 11 лютага, пасля ўзлёту з аэрапорта ў Дамадзедава. Самалёт выконваў рэйс з Масквы ў горад Орск Арэнбургскай вобласці. На борце знаходзіліся 65 пасажыраў і 6 членаў экіпажа, усе яны загінулі.

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста выказаў глыбокія спачуванні Прэзідэнту Расіі Уладзіміру Пуціну, родным і блізкім трагічна загінулых у авіякатастрофе ў Падмаскоўі, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што вестка пра крушэнне пасажырскага самалёта, якое прывяло да шматлікіх чалавечых ахвяр, болем адгукнулася ў сэрцах беларусаў. «Мы шчыра падзяляем з братэрскім народам Расійскай Федэрацыі смутак і боль у сувязі з гэтай трагедыяй», — гаворыцца ў спачуванні.**

### ЗША ВЫКАЗАЛІ ГАТОЎНАСЦЬ ДА ПЕРАМОЎ З КНДР

Злучаныя Штаты гатовыя сесці за стол перамоў з КНДР. Пра гэта заявіў віцэ-прэзідэнт ЗША Майкл Пенс у інтэрв'ю газеце The Washington Post (WP). Ён расказаў, як абмеркаваў з паўднёвакарэйскім лідарам Мун Чжэ Інам умовы для далейшага ўзаемадзеяння з Пхеньянам, якое пачне спачатку Рэспубліка Карэя і патэнцыйна Злучаныя Штаты неўзабаве пасля таго. Пенс сказаў, што гэта «максімальны ціск і ўзаемадзеянне ў той жа час». Як адзначае WP, гэта важная змена папярэдняй пазіцыі Вашынгтона.

### КАНФЛІКТ У СІРЫІ ЎВАЙШОЎ У АДНУ З САМЫХ КРОВАПРАЛІТНЫХ СТАДЫЙ



Падчас авіяўдараў па тэрыторыі Сірыі толькі за першы тыдзень лютага загінула больш за адну тысячу мірных жыхароў. Гэта стала адным з самых высокіх паказчыкаў за ўвесь час супрацьстаяння, паведамілі ў канцылярыі генеральнага сакратара ААН Антоніу Гутэрыша. Ён выказаў занепакоенасць «трывожнай ваеннай эскалацыяй у Сірыі, якая перацякае за яе межы». Генеральны сакратар ААН нагадаў бакам канфлікту пра абавязацельствы ў рамках міжнароднага гуманітарнага права, а таксама заклікаў усіх «працаваць над дасягненнем неадкладнага і безумоўнага спынення гвалту і праявіць стрыманасць».

### ФРАНЦУЗСКІ НАЦФРОНТ МЯРКУЕ ЗМЯНІЦЬ НАЗВУ

Французская партыя «Нацыянальны фронт» (НФ) можа адмовіцца ад сваёй гістарычнай назвы ўжо ў сакавіку, калі пытанне аб перайменаванні будзе вынесена на галасаванне сярод яе членаў. Гэта пацвердзіла лідар Нацфронта Марын Ле Пен, выступаючы ў эфіры радыёстанцыі Europe 1. «Думаю, што «Нацыянальны фронт «пачынае новы раздзел сваёй гісторыі», — сказала палітык. На думку Ле Пен, зараз для яе партыі «пачынаецца новая прыгода», у час якога Нацфронту трэба будзе зведаць глыбокую трансфармацыю. «Гэта прыгода павінна прывесці нас да ўлады», — заўважыла палітык.

### У ЯПОНІІ З-ЗА МОЦНЫХ СНЕГАПАДАЎ ЗАГІНУЛІ СЕМ ЧАЛАВЕК

Не менш як сем чалавек загінулі за апошні тыдзень у розных раёнах Японіі з-за інцыдэнтаў, выкліканых моцнымі снегападамі. Калецтва і траўмы атрымалі больш за 70 чалавек, паведамляе тэлеканал NHK. Найбольшая колькасць ахвяр зафіксавана ў прэфектуры Фукуа на ўзбярэжжы Японскага мора, дзе вышыня гурбаў у дні найбольш багатых ападкаў дасягала двух метраў. Многія людзі разбіліся да смерці, калі спрабавалі ачысціць дахі сваіх дамоў. Як вядома, моцныя апады ў Японіі не спыняюцца ўжо другі тыдзень.

■ Не прапусці!

# ПЕРШЫ КРОК ДА ПАСПЯХОВАЙ КАР'ЕРЫ

**Як выбраць будучую прафесію і навучальную ўстанову? Што трэба ведаць і рабіць, каб знайсці працу сваёй мары? Якія прафесіі будуць запатрабаванымі ў найбліжэйшыя гады? Адказы на гэтыя і многія іншыя пытанні можна будзе знайсці на выстаўцы «Адукацыя і кар'ера — 2018», якая пройдзе 15—17 лютага ў Мінску ў выставачным павільёне на праспекце Пераможцаў, 14.**



Фота Надзеі БУЖАН.

Выстаўка арганізуецца ўжо шаснаццаты раз. Яе мэта — дапамагчы абітурыентам, студэнтам і ўсім, хто цікавіцца сферай адукацыі, знайсці для сябе месца вучобы, курсы дадатковай адукацыі, праграму стажыроўкі і гэтак далей.

Мерапрыемства каштоўнае тым, што ў яго наведвальнікаў ёсць магчымасць ужывую пагутарыць з прадстаўнікамі ўстаноў адукацыі і задаць ім любыя пытанні адносна паступлення. Плюс на стэндах заўсёды працуюць актыўныя студэнты, якія раскажуць пра ўсе нюансы навучання. У гэтым годзе на выстаўцы чакаюць прадстаўнікоў з Беларусі, Расіі, Францыі, Германіі, Ізраіля. У іх можна будзе даведацца аб правілах прыёму ў замежныя ВНУ, умовах пражывання і праграмах абмену.

Так, Ізраільскі культурны цэнтр пры пасольстве Дзяржавы Ізраіль у Рэспубліцы Беларусь праводзіць 15 лютага з 12 да 13 гадзін сустрэчу для вучняў старшых класаў і выпускнікоў школ на тэму «Вышэйшая адукацыя і жыццё студэнтаў у Ізраілі».

А 17 лютага з 11 да 13 гадзін будзе арганізаваны экскурс у сферу IT «Прафесіі будучыні. TestDrive ў IT», падчас якога спікеры раскажуць, якія ўніверсітэты яны скончылі, што ў іх за плячыма і што яны рабілі ў студэнцкія гады, каб дамагчыся поспеху.

Усе тры дні на выстаўцы будзе працаваць інтэрактыўная пляцоўка «Не святыя гаршкі лепяць» — своеасаблівая вітрына рабочых прафесій, дзе пройдуць найцікавейшыя майстар-класы: «Выраб дэкаратыўнай ружы з металу», «Саломапляценне. Сувеніры з саломкі», «Лепка з салёнага цеста», «Выраб фігурак з масцікі», «Разумны дом» і іншыя.

Мінскі дзяржаўны прафесійна-тэхнічны каледж швейнай вытворчасці арганізуе дэманстрацыю калекцый тэатра мод «Адважнае рашэнне», Мінскі гарадскі педагагічны каледж — творчую майстэрню «Незвычайнае ў звычайным», а Мінскі дзяржаўны прафесійны ліцэй № 10 будаўніцтва — майстар-клас «Выраб драўлянай развіццёвай цацкі для дзяцей ад трох гадоў. «Цуда-канструктар».

**Час работы выстаўкі: 15 і 16 лютага з 10 да 18 гадзін, 17 лютага — да 15 гадзін.**

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■ Алімпіяда-2018

# ВЕЦЕР І МАРОЗ МЯНЯЮЦЬ ПЛАНЫ

## Стартавыя спаборніцкія дні ў Пхёнчхане не прынеслі беларусам медалёў

**Першай чэмпіёнкай XXIII зімовых Алімпійскіх гульняў у Паўднёвай Карэі стала шведская лыжніца Шарлота Кала, яна заваявала залаты медаль у лыжным скіятлоне. Для 30-гадовай спартсменкі гэта ўжо трэцяе «золата» Алімпіяды — да гэтага яна стала чэмпіёнкай на двух папярэдніх Гульнях у Ванкуверы-2010 і Сочы-2014.**

З лыжных гонак пачалі выступленне і беларусы, Юлія Ціханава (стала 42-й) і Паліна Сераносава (46-я на фінішы) у скіятлоне на медалі не прэтэндавалі, аказаўшыся бліжэй да канца фінішнага пратакола. Прыкладна такія ж пазіцыі ў гэтым відзе праграмы і ў нашых мужчын: Міхаіл Сямёнаў заняў 44-е месца, Юрый Астапенка — 50-е, Сяргей Далідовіч сышоў з дыстанцыі на самым пачатку гонкі, не дабраўшыся да адзнакі 4,63 кіламетра. *«Сышоў з дыстанцыі з-за праблем з бронхамі і ўсім, што з гэтым звязана. Зараз адчуваю сябе нармальна. Шкада толькі, што падвёў усіх, хто за мяне хварэе,* — пракаментаваў здарэнне Далідовіч. — *Падвялі старыя балячкі. Калі тэмпература ніжэй за мінус 15, то стараюся не выступаць, на стадыёне ў нядзелю было 12 градусаў марозу, на далёкай кропцы — мінус 17».* Сёння лыжнік ужо аднавіўся і гатовы выступіць у гонцы на 15 км, якая павінна адбыцца ў пятніцу.



Куды больш вялікія надзеі беларускія балельшчыкі ўскладалі на біятланістаў. Аднак у спрынтарскай гонцы прыма беларускага біятлона Дар'я Домрачава дапусціла крыўдны промах, які дазволіў ёй стаць толькі 9-й і стартаваць у гонцы пераследу ўчора з адставаннем у 46 секунд. Ураганны вецер, які палохае практычна ўсіх спартсменаў у Пхёнчхане, перашкаджаў і біятланістам у панядзелак. З-за яго Домрачава дапусціла шэсць промахаў, чатыры з якіх — на апошнім агнявым рубяжы, паказала найгоршы вынік хуткастрэльнасці сярод усіх удзельніц гонкі і заняла толькі 37-е месца. *«Хацела змагацца. На жаль, атрымалася так, як атрымалася,* — разважае над сваім выступленнем Дар'я. — *Чацвёртая стральба? Усё ясна і зразумела. Моцны вецер быў дастаткова непрадказальны, парывы то сціхалі, то зноў аднаўляліся з вялікай сілай. Падчас апошняй стральбы як раз быў моцны парыў. Але я ўжо і так разумела, што лідары адправіліся на дыстанцыю. Таму вырашыла рызыкнуць: не бачыла сэнсу чакаць. На жаль, рызыка сябе не апраўдала. Застаецца толькі развесці рукамі. Жыццё на гэтым не заканчваецца».*

Астатнія беларускія спартсмены ў мужчынскай і жаночай гонках пераследу таксама не ўвайшлі ў ТОП-10.

Прадстаўнік шорт-трэка Максім Сяргееў на дыстанцыі 1500 метраў заняў 28-е месца і завяршыў сваё выступленне на Алімпіядзе-2018. Канькабежка Марына Зуева стала 11-й на дыстанцыі 3000 м, а вось на дыстанцыі 1500 м наша спартсменка была дыскваліфікаваная, суддзі ўгледзелі ў забегу парушэнні з боку Марыны. *«Спартсменка вельмі хвалявалася,* — адзначыў яе настаўнік Сяргей Мінін. — *Стартаваць у першы дзень Алімпіяды з псіхалагічнага пункту гледжання няпроста любому атлету. Канчатковыя вынікі ў многіх вядучых спартсменаў свету аказаліся вельмі шчыльнымі. Месцы з шостага па адзінаццатае падзяляе крыху больш за паўтары секунды».* Мінін пры гэтым падкрэсліў, што вынік 4 хвіліны 05,96 секунды на дыстанцыі ў 3000 м для Марыны з'яўляецца персанальным рэкордам і найлепшым паказчыкам на раўнінных катках на сённяшні дзень.




Адзначым, што з-за моцнага ветру ў Пхёнчхане былі адмененыя старты гарналыжнікаў, у тым ліку перанесены гонкі, у якіх павінны былі ўдзельнічаць нашы спартсмены Марыя Шканава і Юрый Данілачкін.

Моцны вецер можа перашкодзіць, мабыць, і нашым асноўным алімпійскім надзеям — фрыстайлістам. Галоўны трэнер беларускай зборнай Мікалай Казека адзначае, што ўсе спартсмены здаровыя і настройваюцца на галоўныя спаборніцтвы самым сур'ёзным чынам. На трэніроўках настаўнікі ў літаральным сэнсе слова ловяць моманты, калі нашы спартсмены могуць падысці да трампліна, каб адпрацаваць свае скачкі. *«Спадзяёмся, што ўмовы надвор'я ў «Фенікс-Парку» дазволяць камандзе плённа трэніравацца і выйсці на старт у прыўзнятым настроі»,* — кажа Казека. Нагадаем, спаборніцтвы ў лыжных акрабатаў пройдуць 15—18 лютага.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ**

■ Сугучча

# Уцёкі на край дажджу

## У Маскве пабачыў свет «беларускі выпуск» «Раман-газеты»

**Пад адной вокладкай сучасную прозу Беларусі прадстаўляюць Алег Ждан, Алена Папова, Алена Брава, Людміла Рублеўская, Алесь Бадак. Назву выпуску «Уцёкі на край дажджу: сучасная проза Рэспублікі Беларусь» дало адно з апавяданняў Алеся Бадака.**




Варта заўважыць, што «Раман-газета» апошнім часам неаднойчы звярталася да беларускай прозы. Паралельна нядаўна ў розных яе выпусках друкаваліся творы Вячаслава Бандарэнкі, Сяргея Трахімёнка. У «Детской роман-газете» — Уладзіміра Ліпскага. А што да ранейшых часоў, то з гісторыяй выдання звязаны імёны народных пісьменнікаў Беларусі Васіля Быкава, Івана Шамякіна, Івана Чыгрынава, шмат каго яшчэ з аўтарытэтных літаратараў. Публікацыя ў гэтым выданні, як правіла, звязаная з вялікімі тыражамі, прыносіла пісьменнікам усесаюзную славу, спрыяла веданню пра іх творчасць не толькі на прасторы Савецкага Саюза, але і паўсюль, дзе шматнацыянальную савецкую літаратуру адкрывалі праз рускую мову.

— Мы збіраемся зрабіць такі «беларускі выпуск» традыцыйным, — дзеліцца сваімі развагамі галоўны рэдактар «Роман-газеты» Юрый Казлоў. — Ведаю, што ў Беларусі і сёння даволі інтэнсіўна развіваецца проза. Найлепей — жанр аповесці. З цікавасцю чытаю часопіс «Нёман». Сачу за навінкамі беларускіх кніжных выдавецтваў. Такое супрацоўніцтва па прадстаўленні нацыянальнай прозы на рускай мове, на мой погляд, спрыяе і развіццю мастацкага перакладу.

Добра было б, каб новы творчы праект заўважылі і ў маскоўскім Літаратурным інстытуце імя М. Горкага, дзе заўжды сярод навучэнцаў былі і перакладчыкі нацыянальных літаратур. А самае галоўнае пажаданне «новаму караблю» ў беларуска-расійскім творчым супольніцтве — шырэйшага ведання пра беларускую прозу ў розных рэгіёнах Расійскай Федэрацыі.

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

ООО «ГИРИЗ»
**ГИДРАВЛИКА:** гидроцилиндры, насосы, распределители
РВД и комплектующие
Напорные рукава и шланги
Техпластины
Ремонт гидравлических узлов
**ДОСТАВКА ПО ВСЕЙ БЕЛАРУСИ**
Самые конкурентные цены
**В НАЛИЧИИ МНОГО ТЕХНИКИ ПО ЦЕНАМ ВЕСНЫ 2017 ГОДА**
Плуги, бороны, прицепы и полуприцепы. Запчасти к ним.
**ВОЗМОЖЕН РАСЧЕТ ВСТРЕЧНЫМИ ПОСТАВКАМИ, ДОГОВОРАМИ ПЕРЕВОДА ДОЛГА.**
+375 44 765 08 65 г. Заславль, ул. Советская, 122, каб 126
**girza.by**
УНП 691586696

■ Надвор'е

# Ішоў невялікі снег

## А ў пятніцу — зноў з плюсам

**На гэтым тыдні захаваецца зімовы характар надвор'я са снегам і невялікімі маразамі, паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды. У першай палове тыдня ўмовы надвор'я будзе вызначаць вільготная паветраная маса, якая паступае па перыферыі шырокага антыцыклону, які раскінуўся над Расіяй.**

Сёння чакаецца воблачнае з праясненнямі надвор'е, у асобных раёнах краіны невялікі снег. Месцамі слабыя туман і галалёд. На асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ў асноўным будзе ў межах 1—7 марозу, толькі па захадзе краіны ад нуля да 1 цяпла. У сераду ў асобных раёнах краіны пройдзе невялікі кароткачасовы снег. Уначы тэмпература паветра складзе мінус 4—10 градусаў, пры праясненнях месцамі паветра астудзіцца да 11—12 марозу. Тэмпература ўдзень будзе мінус 1—7 градусаў. Атмасферны фронт выкліча ў чацвер ноччу ў некаторых раёнах, а ўдзень на большай частцы краіны кароткачасовы снег. На асобных участках дарог захаваецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе мінус 4—10 градусаў, пры праясненнях месцамі яна панізіцца да 11—12 марозу. Удзень будзе ад нуля да мінус 6 градусаў.

Згодна з папярэднімі прагнозамі айчынных спецыялістаў, у пятніцу атмасферны фронт і больш цёплая паветраная маса, якая паступае з Заходняй Еўропы, абумовяць на большай частцы тэрыторыі краіны кароткачасовы снег і мокры снег. Месцамі чакаецца туман, галалёд, на дарогах галалёдзіца. Адносна пацяплее. Уначы чакаецца 2—8 марозу, а тэмпература паветра ўдзень будзе ад мінус 3 градусаў да 2 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ**

■ На слыху

# ТРАГЕДЫЯ Ў КОБРЫНЕ

Гэта жудасная навіна літаральна скалыхнула раённы цэнтр Кобрын. Увечары выхаднога дня невядомы з нажом напаў на сямейную пару і стаў наносіць шматлікія ўдары кожнаму з іх. Зрабіўшы сваю чорную справу, злыдзень уцёк. Сужэнцаў даставілі ў бальніцу. Але праз гадзіну 31-гадовая жанчына памерла. Яна была цяжарная. Яе 39-гадовы муж у рэанімацыі, за яго жыццё змагаюцца медыкі.

Як паведаміў афіцыйны прадстаўнік УСК па Брэсцкай вобласці Дзмітрый Іванюк, заведзена крымінальная справа, праводзяцца следчыя дзеянні, вядзецца пошук злачынцы.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

# «СВІТАНАК» НАД КАЎКАЗАМ

**У мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» адкрылася выстаўка «Зунзул чані» дагестанскага мастака і пісьменніка Марата Гаджыева, арганізаваная напярэдадні XXV Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу.**

Назву гэтай серыі графічных работ можна перавесці як «Світанак». Яны выкананы на тутавай і рысавай паперы, прычым, калі процілеглыя бакі кожнай з карцін прыкласці адзін да аднаго, атрымаецца цыклічны вобраз. Аўтар прызнаўся, што для яго час узыходу сонца — вельмі важная частка жыцця.

Рэспубліка Дагестан з'яўляецца адной з самых незвычайных і шматнацыянальных у Расійскай Федэрацыі. Нягледзячы на значную адлегласць паміж ёй і Беларуссю, краіны падтрымліваюць даволі моцныя сувязі. Так, многія дагестанцы знайшлі ў Сінявокай сваю другую радзіму.

Праграма «Праз літаратуру і мастацтва да міру і стварэння» дазваляе беларусам знаёміцца з творчасцю замежных майстроў. Гэта выстаўка не стала выключэннем, яна была арганізавана сумесна з Выдавецкім домам «Звязда» пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі і Міністэрства культуры.

Аўтар мастацкіх работ Марат Гаджыеў з'яўляецца актыўным дзеячам на культурнай ніве. У сябе на радзіме ён стаў заснавальнікам і галоўным рэдактарам каўказскай літаратурна-мастацкай газеты «Горцы», дырэктарам грамадскай арганізацыі «Каўказскі дом перакладаў», галоўным бібліятэкарам Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Дагестан імя Расула Гамзатава. Разам з калегамі-журналістамі Саідам Ніналалавым і Жэмілат Ібрагімавай Марат Гаджыеў прэзентаваў у Мінску кнігі, што былі выдадзены апошнімі гадамі ў Махачкале.

— Чаканне ўзыходу сонца было доўгім і трывожным — мы ляцелі сюды і гадалі, якім чынам беларускі глядач успрыме тое, што нам бы хацелася яму паказаць, — прызнаўся майстар з Дагестана. — На шчасце, цяпер я бачу, што хваляванне было беспадстаўным. Пяць гадоў назад выстаўка, якую вы бачыце, была прадстаўлена ў Махачкале, потым яна трапіла ў Маскву, Краснадар...





Акрамя графічных работ наведвальнікі маглі пагартаць кнігі прысутных аўтараў і літаратурна-мастацкі альманах «Каўказскі экспрэс», адзначаны Гран-пры на Дагестанскім кніжным кірмашы «Таркі-Тау». 120 аўтараў, як маладых, так і прызнаных, сталі пасажырамі своеасаблівага «цягніка», які аб'ядноўвае самыя розныя творы самых розных жанраў. Выданне ілюстравана малюнкамі і фотаздымкамі.

Асобнікі кніг госці перадалі ў падарунак Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, Прэзідэнцкай бібліятэцы Рэспублікі Беларусь, Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі і бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

— Для мяне было ў нейкім сэнсе складана працаваць над кнігай «Соль», — успамінае Марат Гаджыеў. — Яна ўяўляе сабой журналісцкія замалёўкі, якія я збіраў на працягу 15 гадоў. Там ёсць тое, што з часам губляецца ў новым свеце, — асаблівая культура маленькіх вёсачак. Справа ў тым, што да пэўнага часу нашы пасёлкі ў гарах былі адарваныя ад цывілізацыі. Атрымалася, людзі жылі традыцыямі продкаў фактычна да 50-х гадоў мінулага стагоддзя, аднак паступова такі ўклад стаў разбурацца. У кнізе я паспрабаваў апісаць элементы таго старога свету, што судакрануўся з новым. Назіраючы за зменамі, быццам адкрываеш Дагестан нанова. Мне б хацелася адночы ўбачыць такім новым позіркам і Беларусь, бліжэй пазнаёміцца з яе асаблівасцямі і людзьмі, што тут жывуць.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА**

# СЭРЦА БІЛАСЯ ДЛЯ ЛЮДЗЕЙ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Біяграфія Машэрава пачыналася на цяжкіх дарогах вайны і пасляваеннага мірнага будаўніцтва. Колішні партызан, Герой Савецкага Саюза рэгулярна бываў у працоўных калектывах. І не толькі каб лепш ведаць іх справы і клопаты: ён своечасова дапамагаў мудрай парадай, не шкадаваў цёплых слоў падзякі за бескарыслівую добрую працу.

З імем Пятра Машэрава звязаны вялікія дасягненні беларускага народа. Падчас яго кіраўніцтва адбыўся ўздым эканомікі, навукі і культуры, актыўна развіваліся сельская гаспадарка і прамысловасць. Былі пабудаваны такія горадаўтваральныя прадпрыемствы, як Гродзенскі хімічны камбінат «Азот», Гомельскі хімічны завод, Бярозаўская ДРЭС. Пры Машэраве ў Мінску пачалося будаўніцтва метрапалітэна, а Беларусь стала адным з лідараў па вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі. У 1978 годзе Пятру Міронавічу прысвоілі званне Героя Сацыялістычнай Працы.

Як чалавек, які прайшоў вайну, Пётр Машэраў па-асабліваму ставіўся да ветэранаў Вялікай Айчыннай, дбаў аб увекавечванні подзвігу і трагедыі сваіх землякоў. Менавіта дзякуючы яго намаганням у 1974 годзе Мінску было прысвоена званне «Горад-герой». Пры Машэраве адкрыты Курган Славы, створаны такія ключавыя гісторыка-культурныя аб'екты Беларусі, як мемарыяльныя комплексы «Хатынь», «Брэсцкая крэпасць-герой», «Прарыў».



На выстаўцы прадстаўлены таксама асабістыя дакументы.

Красамоўная дэталь: калі «Звязда» адзначала сваё 50-годдзе, на ўрачыстым сходзе, які адбыўся ў Беларускім дзяржаўным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета, прысутнічаў і першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі. Тады, у жніўні 1967 года, Пётр Машэраў прымацаваў да сцяга нашай газеты ўручаную ёй высокую ўрадавую ўзнагароду — ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Даведацца больш пра гэтага легендарнага чалавека, які так шмат зрабіў для беларускага народа, прапануе часовая экспазіцыя «Пётр Машэраў: яго сэрца білася для людзей», якая сёння адкрыецца ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Напярэдадні нашым карэспандэнтам удалося зазірнуць у кулуары яе падрыхтоўкі.

Шматлікія дакументы, фотаздымкі і асабістыя рэчы Машэрава расказваюць аб ім не толькі як аб кіраўніку рэспублікі. Міжволі пераносішся ў студэнцкія гады чалавека-легенды, у сельскую школу, дзе ён некаторы час выкладаў матэматыку і фізіку, у партызанскі атрад імя Шчорса, якім той камандаваў...

Дзякуючы арыгінальным экспанатам становішся сведкам святкавання апошняга прыжыццёвага юбілею Пятра Міронавіча. З 60-годдзем яго віншуюць Пятрусь Броўка, Іван Шамякін, Максім Танк, Мікалай Яроменка... Уяўляеш, як славуты беларускі мастак Міхаіл Савіцкі дорыць кіраўніку краіны яго партрэт, які, дарэчы, шырокай аўдыторыі будзе прадстаўлены ўпершыню, а працоўныя Аршанскага льнокамбіната шчыруюць над кашуляй-вышыванкай, каб парадаваць у юбілей.

Будучы буйным партыйным і дзяржаўным дзеячам, Машэраў заўсёды заставаўся простым і адкрытым для людзей, якіх ён бязмежна любіў. А яны любілі яго: калі перастала біцца сэрца палымянага патрыёта, Пятра Міронавіча без перабольшвання аплаквала ўся краіна...

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**


Адзін з экспанатаў — вышыванка, якая належала Пятру Міронавічу.


Сярод тых, хто працаваў над стварэннем новай экспазіцыі, — вядучы навуковы супрацоўнік Марыя ГАРЭЛІКАВА і навуковы супрацоўнік Ірына ЗАХАРО.

■ Камунальныя стасункі

# СРОДКІ І МЭТЫ

## Сабекошт цеплаэнергіі зменшыцца, а практыка ўцяплення дамоў пры капрамонце за сродкі ўласнікаў павінна прымяняцца паўсюдна

**Мінулы год для ЖКГ, як і папярэдні, прайшоў у рэжыме жорсткай эканоміі, аднак сістэма спрацавала досыць стабільна, без сур'ёзных збояў. Спажыўцам аказаны паслугі ў запатрабаваных аб'ёмах. Скарачаецца колькасць запазычанасцяў за жыллёва-камунальныя паслугі і плануецца карэкціроўка адпаведных законаў. У аснову канцэпцыі развіцця ЖКГ да 2025 года пакладзены прыярытэтны кірунак: забеспячэнне грамадзян камфортнымі ўмовамі пражывання за кошт павышэння надзейнасці функцыянавання аб'ектаў з адначасовым зніжэннем затрат на аказанне ЖКП. Пра гэта падчас выніковай калегіі ведамства расказаў міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Аляксандр ЦЕРАХАЎ.**

### САБЕКОШТ ЖКП І КІРАВАННЕ ЗАТРАТАМІ

Нягледзячы на тое, што заданне па зніжэнні затрат на аказанне жыллёва-камунальных паслуг у краіне ў цэлым выканана, асобныя камунальныя гаспадаркі дапусцілі перавышэнне сабекошту паслуг над устаноўленымі нарматыўнымі цэнамі. Такім чынам, звышнарматыўныя затраты склалі каля 3 млн рублёў. (Праўда, у пазамінулым годзе гэтая лічба была 4,5 млн.)

— Уласнікам, рэгіянальным уладам трэба ўзяць пад асаблівы кантроль гэтыя арганізацыі. Павінны быць перагледжаны і зацверджаны бізнес-планы іх развіцця, — заўважыў міністр. — Галоўнымі метадолагамі-аўдытарамі павінны выступіць дзяржаўныя аб'яднанні жыллёва-камунальнай гаспадаркі абласцей. Я прашу вас знайсці сабе практычнае прымяненне і апраўдаць грошы, якія вы збіраеце з усіх прадпрыемстваў вобласці.

З кіраваннем затратамі таксама ёсць складанасці, зазначыў Аляксандр Церахаў. У сабекошт ЖКП лепш за ўсіх укладзіся Брэстаўчане і Віцебская вобласць. Гэта значыць, што ад планава-разліковых цэн названыя рэгіёны атрымалі найбольшую аддачу і прыбытак. Астатнія пакуль дэманструюць гатоўнасць да поспеху і пакрываюць свае выдаткі за кошт магчымага прыбытку, а гэта немалых аб'ёмы сродкаў. «Калі б планы выконваліся, то Мінск мог бы накіраваць на развіццё больш як 11 млн рублёў, Магілёўская вобласць — больш за 6 млн, Гомельская — каля пяці».

Страты, звязаныя з утрыманнем нямпрофільных актываў, узраслі ў Гомельскай і Мінскай абласцях. Па даручэнні ўрада Брэсцкім, Віцебскім, Гродзенскім, Магілёўскім аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам для работы з няпрофільнымі актывамі створаны адпаведныя прадпрыемствы. Іх у краіне 11. Аднак такія арганізацыі не створаны ў Гомельскай і Мінскай абласцях.

### ЗАПАЗЫЧАНАСЦЬ ПА СУБСІДЫЯХ І ПАСЛУГАХ

Пратэрмінаваная запазычанасць за паслугі ЖКГ у краіне існуе як у насельніцтва, так і ў юрыдычных асоб. Прычым у апошніх гэтая лічба ўтрая вышэйшая, чым у фізічных асоб. 43 % з іх — гэта сельскагаспадарчыя прадпрыемствы.

— Тут вы павінны і можаце прымяніць усе меры адміністрацыйнага ўздзеяння да даўжнікоў, ажно да адключэння, — заклікаў міністр. — Мы сёння вышукваем фонды, прыцягваем крэдыты, каб будаваць станцыі абезжалезвання, ачышчальныя збудаванні, перакладваць цеплатраскі і сеткі водазабеспячэння, а ў дэбіторскай запазычанасці юрыдычных асоб знаходзіцца амаль 40 млн долараў.

Разам з тым скарачаецца пратэрмінаваная запазычанасць бюджэтных арганізацый. «Летась гэта была зона крытыкі, а сёлета, я прагназую, пытанняў быць не павінна», — адзначыў станоўчы момант міністр.

Зменшылася таксама запазычанасць арганізацый па субсідаванні аплаты паслуг ЖКГ насельніцтву. Летась запазычанасць з мінулага года была амаль 24 млн рублёў, сёлета яна складае не больш за 10 млн. У Віцебскай і Гомельскай абласцях разлічыліся поўнасцю.

### ЦЯПЛО ПА САБЕКОШЦЕ

Вытворчасць цеплавой энергіі — самая дарагая паслуга. І Прэзідэнт паставіў задачу знізіць у 2018—2019 гадах сабекошт энергіі, якую выпрацоўваюць арганізацыі ЖКГ уласнымі крыніцамі энергіі, і гэта дасягальна, заўважыў міністр.

Сабекошт выкарыстання на новых кацельных шчэпак і торфу — 70—75 рублёў за Гкал і нават менш, і знізіць яе яшчэ больш рэальна. Летась уведзена ў эксплуатацыю 84 Мвт высокаэфектыўных магутнасцяў на мясцовых відах паліва (МВП), а гэта 130 % ад плана. Сёлета задача значна больш складаная — увесці кацельных на больш як 160 Мвт.

Сабекошт цеплаэнергіі па краіне быў 99,3 руб. за адну Гкал пры прагназаваным кошце 101 рубель. Мэта знізіць яго да 80 руб. Пры гэтым у сістэме засталася яшчэ 1191 цеплакрыніца, якая мае высокі сабекошт выпрацаванай энергіі. Прычына гэтага — неэфектыўная загружанасць кацельнага абсталявання.

### МІНУСЫ І ПЛЮСЫ КАПРАМОНТУ

Пад асаблівым кантролем знаходзіцца і жыллёвы фонд. Летась адрамантавана 2,6 млн м² жылля. Па словах міністра, нягледзячы на ўсе прынятыя меры, застаюцца фактары, якія замаруджваюць правядзенне капрамонту: тэрміны выканання работ, адсутнасць комплекснасці і індывідуальнай працы з насельніцтвам. Не ўдалося пакуль выключыць дамы з перавышаным нарматыўным тэрмінам будаўніцтва. Сёння іх у краіне пяць, тры з якіх — у Віцебскай вобласці.

— Таннае будаўніцтва — гэта хуткае будаўніцтва. Рэзервы ў скарачэнні тэрмінаў правядзення работ паказаў капрамонт за месяц. Неабходна сабраць усё станоўчае і ўкараніць у шырокую практыку. Зніжэнне кошту і скарачэнне тэрмінаў не павінна ўплываць на комплекснасць рамонту, — акрэсліў Аляксандр Церахаў. — А пра работу з насельніцтвам і казаць сорамна. Дайшло да таго, што ўласнікі хочуць унесці свае грошы ва ўцяпленне свайго жылля, а арганізацыі галіны не маюць жадання арганізаваць адпаведныя работы. Адсутнічае дыялог з кліентам пры аказанні адной з самых галоўных камунальных паслуг. Практыка ўцяплення жылых дамоў насельніцтвам падчас капрамонту павінна прымяняцца паўсюдна, дзе людзі хочуць гэта выканаць.

Міністр таксама адзначыў, што асобным кірункам пры правядзенні капрамонту павінна стаць арганізацыя пакватэрнага рэгулявання спажывання цеплаэнергіі. «Ніводнае заданне не павінна выконвацца без папярэдняга сходу з уласнікамі. Вынікам усяму павінен быць заключаны дагавор», — рэзюмаваў ён.

Летась законам аб рэспубліканскім бюджэце па пяці кірунках (капрамонт, замена ліфтаў, мадэрнізацыя кацельных, замена цеплasетак і сетак водазабеспячэння і каналізацыі) устаноўлены мінімальныя нарматывы бюджэтнай забяспечанасці. Гэта зроблена, каб мясцовыя органы ўлады не мелі магчымасці памяншаць агульны аб'ём бюджэтных сродкаў, прадугледжаных на названыя кірункі. Можна толькі перамяркоўваць сродкі паміж гэтымі мерапрыемствамі без памяншэння агульнай сумы, заўважыў Аляксандр Церахаў. Аднак, акрамя Віцебскай вобласці і сталіцы, па ўсіх рэгіёнах відаць парушэнні. У Брэсцкай вобласці з названых мерапрыемстваў знята 2 млн рублёў, Гомельскай — 3,7, Гродзенскай — 1,6, Мінскай — 2,3, Магілёўскай — 6,1 млн. «З капрамонту выканкамамі знята 53 млн рублёў. А гэта нават па гранічным кошце больш за 300 тысяч м² уведзенага жылля», — акрэсліў міністр.

Удасканаленне і мадэрнізацыя сістэмы суправаджаецца распрацоўкай і прыняццем нарматыўна-прававых актаў. Летась міністэрства распрацавала 36 такіх дакументаў, сёлета мае адбыцца не меншая работа, заўважыў Аляксандр Церахаў. Асноўныя дакументы для карэкціроўкі: Жыллёвы кодэкс, Падатковы кодэкс, змяненні ў закон аб ахове правоў спажыўцоў ЖКП, закон аб змяненні закона па пытаннях пахавання, закона па добраўпарадкаванні і падтрымцы ў належным санітарным стане тэрыторый населеных пунктаў. А таксама як мінімум 15 праектаў указаў Прэзідэнта, якія будуць рэгуляваць пытанні дзейнасці таварыстваў уласнікаў, абыходжання з адходамі карыстання, стварэння залогава-дэпазітнай сістэмы, укараненне цеплавой мадэрнізацыі дамоў. Будзе скарэктавана праграма «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе».

**Ірына СІДАРОК**

■ Транспарт

# ШЛЯХІ І ЗНОСІНЫ

## У метро можна будзе прайсці па банкаўскай картцы, а з Брэста да Мазыра — дабрацца па вадзе

**Падыходы ў рабоце з пасажырамі, укараненне інфармацыйных тэхналогій у сталічнай падземцы і павышэнне аб'ёму грузаперавозак абмяркоўвалі на пасяджэнні калегіі Мінтранса. Гаварылі пра выніку работы транспартнага комплексу краіны ў 2017 годзе і задачах па яго развіцці на 2018-ы. Па словах намесніка прэм'ер-міністра Анатоля КАЛІНІНА, які прыняў у ім удзел, важнае месца ў абмеркаванні занялі пытанні развіцця гарадскога транспарту і метрапалітэна.**

### Новыя тэхналогіі ў метро

Рарытэты ў музей спадар Карповіч пачаў збіраць у 2005 годзе: да сваіх запасаўададаліся тыя, што прыносілі суседзі па гаражы. Ездзіў збіраў старыя тэлевізары, радыёмагнітафоны, дэталі да іх па ўсім горадзе. Многае з апаратуры знаходзілася на сметніку. «Самае засмучэнне было, калі сусед па гаражы першы мінскі прыёмнічак «Піянер» выкінуў на сметнік. Я ў шоку быў! Бацька яго быў партыйным работнікам. Ён яму па талончыку дастаўся. Гэта экспанат бясцэнны быў», — успамінае інжынер.



Калекцыя музея ўключае ў сябе некалькі тэматычных раздзелаў, самы вялікі з якіх — бытавая апаратура розных эпох. Тут ёсць радыёпрыёмная апаратура, музычныя цэнтры і радыёкомплексы, радыёапаратура прайгравання і запісу гуку, тэлевізійная апаратура, хатняе кіно (тое, што было да відэамагнітафонаў) і іншае.

### Хто раней меў «Спідолу», цяпер бы катаўся на Bentley

У спадара Карповіча захапленне радыёэлектронікай было на ўзроўні фанатызму: як з'явілася летам 1962 года, так і не праходзіць па сённяшні дзень. Майстар наракае, што ў пераважнай колькасці людзей цікавасць да экспанатаў чыста знешняя: вабяць «прыгожанькія карпусы», а для яго самога першаснае — унутраная «начынка». У планах інжынера зрабіць самыя важныя апараты музея БДУІР з празрыстымі карпусамі, каб было відаць, як яно ўнутры працуе. У запасах экспазіцыі ёсць наборы для радыёканструявання: калі было мала апаратуры, тыя, хто ўмеў, збіралі яе самі.

Сёння ў майстра сабрана каля сотні тэлевізараў розных памераў і розных гадоў. Самым рарытэтным экспанатам з'яўляецца прыёмнік 1946 года, пасля іх па часе ішлі радыёлы. У пачатку 60-х гадоў увайшлі ў моду радыёкамбайны — некалькі апаратаў у адным корпусе. Прадстаўлена «Беларусь 110» — гэта апошняя мадэль з радыёкамбайнаў (тры апараты ў адным корпусе: тэлевізар, шматдыяпазонны прыёмнік і прайгравальнік грампласцінак). Пасля ў 70-я гады перайшлі да радыёкомплексаў — радыёкамбайн падзялілі на асобныя блокі. Да таго ж ёсць электрафоны.

«Хто раней меў «Спідолу», цяпер бы катаўся на Bentley, каб быў больш зразумелы ўзровень, — жартуе інжынер. — Такія апараты маглі мець людзі, якія займалі высокія кіраўнічыя пасады».

Некаторыя экспанаты музея з сімволікай Алімпіяды-1980 па футболе. Напярэдадні гульняў усім заводам далі заданне выпускаць па сваім профілі апаратуру з эмблемай, кажа суразмоўнік. Цікава, што дызайн тэхнікі, гэтак жа як і адзенне, паўтараецца: была мода на вуглаватыя карпусы, потым сталі рабіць больш круглыя формы, кажа Пётр Пятровіч. Варта адзначыць, што ў музеі шмат беларускай апаратуры, якую выраблялі не толькі ў Мінску, але і ў Гродне, Брэсце, а таксама экспанаты з іншых рэспублік былога Савецкага Саюза.

**Наталля ПАЎЛЮКЕВІЧ**

Пантэон Айчыны

# Казімір Ягайлавіч

***(30.11.1427 — 07.06.1492)***

Калі коратка ахарактарызаваць дзейнасць Казіміра Ягайлавіча, малодшага сына Ягайлы і Соф'і Гальшанскай, дык можна сказаць, што гэта дзівосны прыклад, як можна дасягнуць шмат чаго, не прыкладаючы асаблівых намаганняў. Можна было б фантазіраваць, што зрабіў бы на яго месцы — вялікім княжанні — больш дзейны і валявы ўладар, які мэтанакіравана праводзіў бы сваю дзяржаўную палітыку. Магчыма, Вялікае Княства Літоўскае зрэшты зрабілася б каралеўствам і па праве заняло б сваё месца ў еўрапейскім палітычным жыцці. Так не сталася, а сталася так, што за 52 гады праўлення дзяржавай нашых продкаў Казімір гэтак і не ўзвысіў яе, не ўмацаваў і не дасягнуў былой велічы. Былі тут і аб'ектыўныя прычыны (кіраванне дзвюма дзяржавамі, перавага польскіх спраў, актыўнасць Маскоўскай дзяржавы і г. д.), і суб'ектыўныя (нерашучасць, пазбяганне канфліктных сітуацый, марудлівасць у вырашэнні складаных пытанняў). Казіміра Ягайлавіча не назавеш выдатным палітычным і дзяржаўным дзеячам. Як дзяржаўны дзеяч, ён відавочна саступаў свайму бацьку. І ягоныя падданыя як у Літве (ВКЛ), гэтак і ў Польшчы наракалі на Казіміра. Хоць вынікі яго праўлення для Літвы і Польшчы былі розныя. Пры Казіміры Польскае каралеўства, перамогшы Тэўтонскі ордэн, зрабілася моцнай еўрапейскай дзяржавай. І прызнанием гэтага было тое, што каралеўскія пасады ў Чэхіі і Венгрыі заняў Казіміраў сын Уладзіслаў.



І зусім іншыя вынікі праўлення Казіміра ў Літве. Вялікім князем літоўскім і рускім ён стаў у 1440 годзе ў 13-гадовым узросце. Феадалы ВКЛ выбралі яго сваім уладаром, хоць старэйшы брат, польскі кароль Уладзіслаў, выправіў яго на Літву як свайго намесніка.

Юны ўладар, яшчэ падлетак, пераклаў дзяржаўны цяжар на плечы сваіх вяльможаў — радных паноў (паной рады) на чале з фактычным правіцелем віленскім ваяводам Янам Гаштольдам. А сам вялікі князь прападаў на ловах.

Вопытны Ян Гаштольд утрымаў ад мяцяжу Жамойць, вярнуў пад вялікакняжацкую ўладу Смаленск, адбіў спробы сына Жыгімонта Кейстутавіча Міхайлы вярнуць бацькоўскае Троцкае княства. Аднак неўзабаве Казіміру давялося пастаць і ўзяць на сябе цяжар дзяржаўнага праўлення. Пасля гібелі ў бітве пад Варнай з туркамі ў 1444 годзе Уладзіслава палякі прапанавалі Казіміру каралеўскую карону. Як бы ні ўпарціўся юны Казімір, як бы ні хацеў застацца ў мілай яму Літве, а ўсё ж даў сваю згоду і 25 чэрвеня 1447 года каранаваўся ў Кракаве на польскага караля. Такім чынам ён стаў правіцелем Польскага каралеўства і Вялікага Княства Літоўскага, злучыўшы іх асабістай уніяй. Калі ўлічыць, што ў юнага манарха не было вопыту праўлення, дык можна ўявіць, як няпроста і цяжка давялося яму. Трэба было дбаць пра польскія інтарэсы і адначасова не шкодзіць літвінскім, а яны часта не толькі супярэчылі адзін аднаму, а былі варожымі. Вось тут Казімір павінен быў праявіць калі не цвёрдасць, дык палітычную стрыманасць і тактоўнасць, каб палагодзіць абодва бакі. І адтуль, і адгэтуль насядалі на яго, патрабавалі свайго, прымушалі, абвінавачвалі... Літвіны лічылі, што ён спрыяе палякам, і хацелі ўзвесці на свой трон іншага вялікага князя. А палякі меркавалі, што ён спрыяе літвінам, і патрабавалі, каб «палякаў зароўна, як літвінаў, мілаваў», справядліва ставіўся да просьбаў і займаўся абаронай каралеўства. І нават, не маючы довадаў, пужалі Божай карай. Асабліва палякі насядалі на Казіміра з патрабаваннем далучыць да Польшчы Валынь і Падолле і злучыць Вялікае Княства Літоўскае з Каралеўствам. А гэта прывяло б да немінучай вайны паміж Польшчай і Літвой. Казімір адмаўляўся выканаць польскія патрабаванні, спасылаючыся на клятву літвінам абараняць іх дзяржаву. Зрэшты, ратаванне ад настойлівых дамаганняў Казімір знаходзіў у Літве, куды часта прыязджаў.

Пагрозы палякаў пазбавіць яго каралеўскай кароны засмучалі і прымушалі ісці на ўступкі. Польскім панам і шляхце ён не мог супрацьпаставіць ні моц каралеўскай улады, ні інтрыгі, ні сваю асаблівую волю. Летапісцы называлі Казіміра няшчасным, якому лёс прынёс нямала засмучэнняў і непрыемнасцяў. Усё ж гэта занадта суровы прысуд. Што-што, а на лёс Казіміру грэх было скардзіцца. Ён цудам пазбегнуў смерці ў Валожынскіх лясах, калі ўцёк ад змоўшчыкаў, і на полі сечы, калі пасля паражэння ад крыжакоў у Хойніцкай бітве выратаваўся ад пагоні. Выратаваўся ён ад гібелі і ў 1480 г., калі была выкрыта змова супраць яго. Лёс адарыў яго шчаслівым шлюбам з Альжбетай Габсбург, з якой ён меў 13 дзяцей. Спрыяў ён Казіміру і ў дзяржаўных справах. Не валодаючы вайсковым талентам, а толькі сваёй упартасцю Казімір даўёў да перамогі 13-гадовую (!) вайну з Тэўтонскім ордэнам і вярнуў Польшчы Гданьскае Памор'е, Хэлмінскую і Міхалоўскую землі, далучыў заходнюю Прусію разам з Мальбаркам да Каралеўства, а Ордэн зрабіў польскім васалам. Польскім васалам у 1485 г. зрабілася і Малдаўскае гаспадарства. Пасля зацяжных спрэчак з літвінамі да Польшчы адышло Падолле. На чэшскі і венгерскі трон сеў Казіміраў сын Уладзіслаў. Хто яшчэ з польскіх каралёў дамогся такіх значных вынікаў? Ніхто.

А вось для ВКЛ праўленне Казіміра — гэта час страчаных гістарычных шанцаў. Занядбанне літоўскіх спраў прывяло да вялай знешняй палітыкі ВКЛ. Літва толькі рэагавала на знешнюю небяспеку і не праяўляла ні палітычнай ініцыятывы, ні ваеннай сілы для стварэння выгоднага для сябе міжнароднага становішча. Гэтым і скарыстаўся малады і дзейны маскоўскі правіцель Іван III, які ўзвысіў Маскву над Уладзімірскай Руссю і пачаў прэтэндаваць і на былыя землі Кіеўскай Русі. Ягоныя саюзнікі, крымскія татары, спусташалі набегамі паўднёвыя землі ВКЛ, а ў 1480 г. захапілі і спалілі Кіеў.

Такая безыніцыятыўнасць гаспадара выклікала незадавальненне. Частка літвінскіх магнатаў хацела зняць яго з велікакняжацкага трона, а ў 1480 г. нават склалі супраць яго змову з мэтай забойства і ўзвядзення на вялікае княжанне слуцкага князя Міхаіла Алелькавіча. Змова была выкрыта, і змоўшчыкі пакараны, што адбіла ахвоту ў апазіцыі надалей выступаць супраць гаспадара. У сталыя гады Казімір умеў праявіць цвёрдасць. Як бы там ні было, а сваю клятву літвінам Казімір стрымаў — захаваў ВКЛ у цэласнасці, ды яшчэ даў звод законаў «Судзебнік Казіміра» 1468 г. Калі не вялікія ваяр, які праславіўся перамогамі, не мудры ўладар, які памножыў моц краіны, дык Казімір быў добрым працаўніком на дзяржаўнай ніве, і плён ягонай працы застаўся ў гісторыі.

**Вітаўт ЧАРОПКА.**

■ Нацыянальная страва

# «БЕЛАРУСУ БУЛЬБА НЕ ПРЫЕСЦА»

## Гімн нашай любімай ежы, напісаны фізікам, лірыкам і кулінарам

**А вы ведалі, што смажаную бульбу трэба есці нажом і відэльцам, дранікі і аладкі — з дапамогай двух відэльцаў, а вараную бульбу нельга рэзаць нажом? А хто здагадваўся, што з бульбы можна гатаваць не толькі першыя і другія стравы, але і пасту, ікру, масла, крэм і нават напоі? Пра ўсё гэта можна даведацца з «Энцыклапедыі страў з бульбы» — адзінай у свеце кнігі, дзе ўсёахопна і ўпарадкавана змешчана каля 2,5 тысячы рэцэптаў з гэтых клубняў. Прычым гэта толькі трэцяя частка таго, што сабраў за сваё свядомае жыццё яе аўтар Аляксандр БАХАНЬКОЎ, пра якога «Звязда» пісала мінулай вясной.**

**Бульбу можна не толькі есці, але і піць. Напрыклад, прыгатаваць кактэйль «Разаначка»: змяшаць свежы бульбяны сок з таматным, пасаліць. Або прыгатаваць бульбяную «гарбату»: высушанае лупінне здрабніць на млынку і заліць кіпенем.**



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

### Першае, другое і... дэсерт

Не прайшло і года з таго часу, як Аляксандр Арцем'евіч толькі марыў пра стварэнне бульбянога фаліянта, як вось ён, перад вачыма. У бялюткай вокладцы, на якой апетытныя сырыя бульбіны. Аўтар кажа, што спецыяльна абраў менавіта такі малюнак, каб адлюстраваць першапачатковы інгрэдыент, з якога гатуецца безліч страў. Цяпер у аўтара іх каля пяці з паловай тысяч.

Нават па змесце кнігі адразу бачна, што гэта сапраўды энцыклапедыя. Закускі, вінегрэты, салаты; першыя стравы; другія стравы; печыва з бульбай; гаспадыні на заметку; слоўнік кулінарных тэрмінаў.

— Я адразу так планаваў, што ў кнігу павінны ўвайсці такія стравы, каб з іх можна было прыгатаваць паўнавартасны абед: салата, першае, другое, салодкае і напой, — кажа аўтар.

Адной з разынак кнігі аўтар лічыць верш Петруся Макаля, надрукаваны ў якасці прадмовы да яе: «На Беларусі бульба не звядзецца, /А беларусу бульба не прыесца. /Скажу вам, братцы, гэта не сакрэт, /Мне бульба замяняе нават хлеб».

На міжнароднай кніжнай выстаўцы, якая адбудзецца ў канцы лютага, калі атрымаецца, аўтар хоча зрабіць смачную прэзентацыю кнігі, каб госці маглі не толькі падзівіцца на прыгожы фаліянт, а тут жа пакаштаваць дранікі і натхніцца бульбяным духам.

Здавалася б, што тут яшчэ дадаць... А аўтар ужо працуе над працягам. Другое выданне энцыклапедыі будзе ў чатырох тамах. Першы змесціць у сабе закускі, вінегрэты і салаты. Другі — першыя стравы, трэці — другія стравы. А ў чацвёрты ўвойдуць дапаўненні: вегетарыянскія, посныя стравы, бульба ў дзіцячай кухні, у медыцыне, бульбяныя дыеты.

Прыадкрыем некалькі сакрэтаў Аляксандра Арцем'евіча. Першую кнігу з чатырохтомнай серыі плануецца выдаць ужо ў наступным годзе. А дзіцячыя стравы з бульбы будуць падзелены нават па ўзросце: для дашкольнікаў, вучняў малодшых класаў і старэйшых школьнікаў.

### Кропля ў моры

У асабістай бібліятэцы аўтара энцыклапедыі больш за 600 кулінарных кніг. У Аляксандра Баханькова ёсць кнігі пра бульбу, выдадзеныя на Канарскіх астравах, у Японіі, іспанскія, італьянскія, румынскія кнігі... Усе іх збірае сам Аляксандр Арцем'евіч, а пасля пачаў прывозіць старэйшы сын.

Аўтар энцыклапедыі нарадзіўся і да 12 гадоў жыў у невялічкай вёсачцы Гомель у Полацкім раёне. У вясковай сям'і бульба была на стале штодня. Маці дужа смачна гатавала дранікі ды клёцкі, успамінае ён. Цяпер Аляксандр Арцем'евіч і сам часцей за ўсё частуе родных ды сяброў менавіта гэтымі стравамі.

А прадоўжылася захапленне бульбай у Львове на канферэнцыі маладых вучоных, дзе са сваёй курсавой работай прымаў удзел студэнт Баханькоў. У кнігарні там ён убачыў кнігу «Стравы з бульбы».

— Я адкрыў яе паглядзець, ці так гатуюць дранікі ды клёцкі, як мая маці, ці не. Аказалася, не так. Я яе купіў. І пасля ў іншых камандзіроўках набываў, па нашых кнігарнях мэтанакіравана прайшоўся і прыдбаў, што знайшоў.

Калі кніг набралася каля сотні, аўтар вырашыў сабраць усе магчымыя рэцэпты з бульбы, і пачалася ўжо сістэмная праца ў гэтым кірунку.

— Гэта была дрэнная ідэя, — смяецца ён. — І энцыклапедыя, і ўсе назбіраныя мной рэцэпты — толькі кропля ў моры. Насамрэч страў з бульбы дзясяткі тысяч. Яны, можа, і не вельмі адрозніваюцца адна ад адной, але ж і інгрэдыенты, і методыка гатавання ў іх асаблівыя.

**«Бульбяны» музей і помнік**

Аляксандр Баханькоў марыць стварыць у Мінску музей бульбы і ўвекавечыць гэтую расліну ў помніку. Аўтар энцыклапедыі крыху засмучаны тым, што ніводзін з трох сыноў не хоча працягваць справу бацькі, аднак ён верыць, што яго каштоўная кулінарная бібліятэка спатрэбіцца і стане асновай для музея.

Ён спадзяецца, што заспее час, калі бульбе будзе пастаўлены помнік, і збіраецца абмеркаваць ідэю стварэння музея і помніка з мэрам сталіцы. Тым больш што помнік ужо зроблены скульптарам, і яго збіраліся паставіць у скверыку непадалёк ад Нямігі, аднак так і не паставілі. «Трэба гэта выправіць», — лічыць Аляксандр Баханькоў.

### Дранікі, бабкі, клёцкі...

Ён збірае не толькі рэцэпты, а і гістарычныя нарысы пра стравы. Да энцыклапедыі ён за свой кошт выдаў некалькі невялічкіх кніг пра бульбяныя стравы. Прадмова да кожнай з іх — сапраўдны гістарычны і сусветны экскурс, а таксама практычныя парады і правілы этыкету пры ўжыванні страў з бульбы.

— Я па адукацыі фізік, таму прывучаны выкладаць усё сістэмна. Да кожнай кнігі рабіў гістарычную даведку, адкуль узялася страва, як першапачаткова рабілася, — тлумачыць аўтар.

Многія рэцэпты Аляксандр Баханькоў сам удасканальваў, каб усе інгрэдыенты і іх прапорцыі ў страве былі дакладна прапісаны і ўказана, што калі дадаваць:

— Вось пішуць рэцэпт, згадваецца, напрыклад, перац ці соль як адзін з інгрэдыентаў, але дзе і калі перчыць ці саліць — не сказана. Я пастараўся ад усіх гэтых недакладнасцяў пазбавіцца.

Сапраўды, кнігі Аляксандра Арцем'евіча вучаць не толькі гатаваць, а і спасцігаць гісторыю развіцця бульбы. Вось, напрыклад, кніга «Дранікі». Па рэцэптах з яе можна паспрабаваць згатаваць дранікі з каўбасой, семкамі, мочанымі брусніцамі, сырам, тварагом... усё пералічыць цяжка. А яшчэ даведаемся, што дранікі, аказваецца, не беларуская, а нямецкая страва. Іх упершыню ў 1830 годзе згадвае польскі кулінар Ян Шытлер у сваёй кнізе «Кухар добранавучаны» пад назвай «блінкі картафляны». Пасля і беларускія кулінары ўзялі гэтую страву на заметку.

А з кнігі «Стравы з маладой бульбы», акрамя рэцэптаў, можна вынесці цікавы спосаб лупіць бульбу. Памыць яе, пакласці ў цэлафанавы пакет ці палатняны мяшэчак, засыпаць соллю і некалькі хвілін пакатаць яго, моцна прыціскаючы да стала. Бульба такім чынам пазбавіцца ад крохкага лупіння ды яшчэ і будзе адразу пасоленая.

«Беларускія клёцкі» расказжуць, што гэта, шчыра кажучы, нават не самастойная страва, а хутчэй «напаўняльнік» для булёну. На Беларусі клёцкі называюць яшчэ галкі, пызы, капыткі.

Нягледзячы на любоў да бульбы, ёсць стравы, якія аўтар энцыклапедыі не любіць. Яму не падабаецца, напрыклад, малочны суп з бульбай. Не любіць ён таксама і страву, якую маці Аляксандра Арцем'евіча называла «марынаваная рыба».

— Наша вёска знаходзіцца паміж двума азёрамі, таму рыба на стале таксама была амаль штодня. Маці часта гатавала тушаную рыбу з бульбай, якую чамусьці называла «марынаваная». Пры гэтым яна не вымала з яе косткі і клала ў чыгун з галавой і хвастом, таму з дзяцінства не люблю гэтую страву.

### Фізік — па адукацыі, лінгвіст — па імкненні душы

Аляксандр Арцем'евіч усё жыццё адпрацаваў выкладчыкам фізікі. Акрамя захаплення зборам рэцэптаў і ўсебаковым вывучэннем бульбы, ён піша вершы і размаўляе на сямі мовах. Далучэнне да кожнай з моў, дарэчы, — цэлая гісторыя, пра якую варта расказаць асобна. Рускую і беларускую ён проста ведае дасканала, паколькі яны выкладаліся ў школе як абавязковыя дысцыпліны.

Нямецкую ён пачаў вывучаць яшчэ ў школе ў роднай вёсцы. Пераехаўшы ў сталіцу, прыйшлося шукаць школу з адпаведнай мовай. Гэта аказалася школа № 73, дзе мова настолькі добра выкладалася, што Баханькоў дагэтуль можа напамяць чытаць вершы Генрыха Гейне.

— Юлія Барысаўна Рубеньчык, наш класны кіраўнік і выкладчыца нямецкай мовы пераканала бацькоў, што нам трэба выпісаць камуністычную нямецкую газету «Neues Leben» («Новае жыццё») і дзіцячы часопіс «Der Trommel» («Барабан»), — успамінае Аляксандр Арцем'евіч. — І хатнія заданні мы выконвалі па газеце і часопісе, падручнікамі нямецкай мовы амаль не карысталіся.

Англійскую мову, як прызнаецца Аляксандр Баханькоў, ён ведае недасканала. Малады чалавек быў проста вымушаны вывучыць яе, бо калі пісаў кандыдацкую, аказалася, што большасць артыкулаў па яго тэме была на гэтай мове. Таму адначасова пайшоў на курсы ў Дом афіцэраў і ў лінгвістычны ўніверсітэт.

Польская мова ў аўтара энцыклапедыі на ўзроўні побытавых стасункаў пасля шматлікіх паездак у Польшчу.

Балгарскую ж мову вывучыў дзякуючы адной з родных сясцёр. Люда, якая маладзейшая за Аляксандра на чатыры гады, неяк у піянерскім лагеры пазнаёмілася з дзяўчынкай-балгаркай. Тая дасылала ёй лісты на балгарскай, і сястра спачатку хадзіла да бацькі, каб ён ёй перакладаў. Бацька Аляксандра Баханькова, дарэчы, быў сапраўдны паліглот і ведаў усе славянскія мовы. Калі ж яму надакучала перакладаць, ён даў дачцэ падручнік і прапанаваў вучыць самой.

— Люда да моў аказалася нездатнай. Тады бацька сказаў: «Прасі Сашу». Так я пайшоў на курсы ў БДУ на філалагічны факультэт. Я год хадзіў на гэтыя курсы і з дапамогай падручнікаў і слоўнікаў перакладаў лісты.

Літоўскую мову Аляксандр Арцем'евіч вывучыў, каб, як ён кажа, «нармальна размаўляць з літоўцамі пасля кур'ёзнага выпадку». У іх з сябрамі была звычка ездзіць на машыне ў Літву сустракаць 1 мая. Па заведзенай звычцы спыняліся ў горадзе Тракай у гасцініцы «Гальвэ». Адтуль ездзілі глядзець парад у Вільнюс, пасля чаго купаліся ў тракайскім возеры. Холад-холадам, а традыцыя-традыцыяй, лазілі ў халодную ваду. Адзін год здарылася, што і лёд прыйшлося разбіваць, успамінае Аляксандр Баханькоў.

— Аднойчы сядзелі мы ў рэстаране ў гасцініцы, і хтосьці з сяброў папрасіў прынесці кібіны і цэпеліны. Афіцыянт пагардліва так сказаў: «Кібіны ўвогуле ў нас не гатуюць, а цэпелінай прынясу». Я пасля спытаў у знаёмых літоўцаў, чаму ён так да нас паставіўся. Высветлілася, што казаць «цэпеліны» няправільна — гэта адразу выдае прыезджых. А трэба казаць «цэпелінай», бо ў літоўскай мове множны лік перадаецца праз канчатак «ай».

Пасля таго Аляксандру закарцела вывучыць мову, каб больш не трапляць у такое становішча. Але ў Мінску адпаведнай літаратуры не знайшлося. Прыйшлося яму напісаць ліст у «Вячэрні Вільнюс», дзе ён казаў, што хоча вывучыць мову і просіць даслаць падручнік і слоўнік. І літоўцы адгукнуліся — Баханькоў атрымаў добры падручнік і слоўнік.

— Тады я не дадумаўся аддзячыць тым людзям, але ж затое ў энцыклапедыі напісаў страву правільна: цэпелінай, а не цэпеліны, — смяецца ён.

Пасля экскурсіі па старонках гэтай смачнай энцыклапедыі міжволі пагаджаешся са словамі Петруся Макаля: «Якая б ні нахлынула навала, /Я пражыву без солі і без сала, /Але павінен шчыра вам сказаць: /Я не змагу без бульбы існаваць!»

**Ірына СІДАРОК**

«Свидетельство о госрегистрации ИП Алексеевой Ларисы Евгеньевны (УНП 192272963) **считать недействительным** в связи с утерей.


белагропромбанк
традиции будущего

ОАО «Белагропромбанк» сообщает, что в связи с уменьшением с 14.02.2018 г. ставки рефинансирования Национального банка Республики Беларусь на 0,5 процентных пункта до 10,5 процента годовых, **с 15.03.2018 г.** ОАО «Белагропромбанк» уменьшает на 0,5 процентных пункта плавающие процентные ставки по договорам банковского вклада «Универсальный» и «Сберегательный», заключенным в период с 02.08.2004 по 05.03.2006. Также в соответствии с условиями договора пролонгация вклада «Стабильный» осуществляется на условиях применения процентной ставки для данного вида вклада (депозита), действующей на день продления договора.

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности №2 13.01.2017 выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551


23.02.2018 г. в 14.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Гомельжилпроект».

Повестка дня:

1. О совершении сделок общества.

Местонахождение ОАО «Гомельжилпроект»: г. Гомель, ул. Кирова, 17.

Место проведения собрания: г. Гомель, ул. Кирова, 17.

Время регистрации в день проведения собрания с 13.30 до 14.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 15.02.2018 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества. Дата формирования реестра акционеров 10.02.2018 г.

Наблюдательный совет.

УНП 400022625

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

| ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА | |
|---|---|
| Наименование | Характеристика |
| **ЛОТ 1** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | Изолированное помещение, инв. № 412/D-9885 (назначение – торговое помещение, наименование – магазин), площадью 102,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Мосты, ул. Песочная, 13-1 |
| Земельный участок, на котором расположен объект | Кадастровый номер 424050100014000175, (назначение – земельный участок для размещения объектов розничной торговли (для обслуживания здания магазина)), площадью 0,0286 га, расположенном по адресу г. Мосты, ул. Песочная, 13 (доля в праве 13/25) |
| Начальная цена продажи | 50 000 руб. (пятьдесят тысяч рублей) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 5 000 руб. (пять тысяч рублей) |
| Продавец | Мостовский филиал Гроднооблпотребобщества, 231600, г. Мосты, ул. 30 лет ВЛКСМ, 1, тел./факс 8-01515-325-22 |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34 |
| Условия аукциона | Без условий |
| Условия оплаты | По договоренности сторон |
| Срок заключения договора купли-продажи | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/с для перечисления задатка | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 15 марта 2018 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица; *индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются: представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя; физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица; представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 12 марта 2018 г. до 15.00**

*Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32*
*http://grodnoino.by*

## ИЗВЕЩЕНИЕ
### о проведении аукциона по продаже имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Октябрьского (г. Минска) межрайонного отдела управления по г. Минску и Минской области Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь проводит открытый аукцион по продаже недвижимого имущества:

| Сведения о предметах торгов (продаваемом имуществе) | | | | |
|---|---|---|---|---|
| № предмета торгов | Наименование, местонахождение, характеристики продаваемого имущества | Начальная цена, бел. руб. | Сумма задатка (10 % от начальной цены), бел. руб. | Контакт для осмотра объекта |
| 1 | Изолированное помещение (помещение неустановленного назначения), инв. №500D-708161821, общей площадью 12 421,4 кв. м, расположенное в здании цеха металлоконструкций № 2 с бытовыми помещениями по адресу: г. Минск, ул. Рыбалко, д. 26/12-2. **Сведения о земельном участке:** кадастровый номер 500000000003000007, площадь 9,0696 га, выделен на праве временного пользования по 31.01.2019. **Примечание:** изолированное помещение располагается в 1-4-м этажах 4-этажного здания, износ 56 %, год постройки 1967, материал стен – железобетон, кирпичные; 58 изолированных помещений сдаются в аренду: 9 – общ. пл. 296,48 кв. м до 31.03.2020, 49 – общ. пл. 6266,9 кв. м до 31.05.2020. **Особые сведения:** имущество должника. Уполномоченный орган – ИМНС Республики Беларусь по Ленинскому району г. Минска | 7 678 800,00 | 767 880,00 | Заместитель директора ОАО «Стройжмаш» – Лешко Николай Маркович, 8 044 505 16 54 пн.–чт. с 09.00 до 16.30 |

**Задаток в размере 10 % от начальной цены объекта перечисляется на р/с BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015 ОКПО 29250255 Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» не позднее 15.03.2018.**

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 19.02.2016 № 63.

К участию в аукционе допускаются резиденты и нерезиденты Республики Беларусь, своевременно внесшие задаток и подписавшие соглашение с организатором торгов о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие в установленный срок организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); документ, подтверждающий внесение суммы задатка с отметкой банка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона (единственным участником) **в течение 3 рабочих дней** со дня проведения аукциона. Информация о размере затрат доводится до сведения участников перед началом аукциона при заключительной регистрации.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение 20 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Подробный порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях их проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **19.03.2018 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются в рабочие дни с 09.00 до 16.00 по указанному адресу. Окончание приема заявлений **15.03.2018 в 16.00. Телефоны: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

## Извещение о проведении открытого аукциона на право заключения договоров аренды земельных участков в городе Щучине и в Щучинском районе

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта в Щучинском районе | Площадь земельного участка, га | Кадастровый номер | Стоимость затрат на изготовление документации, руб. | Начальная цена продажи, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Земельный участок | Город Щучин, улица Советская, 6Б | 0,0036 | 425850100001000273 | 310,00 | 146,86 | 14,69 |
| 2 | Земельный участок | Василишковский сельсовет, агрогородок Бакшты, улица Центральная, 69А | 0,0038 | 425880400601000149 | 310,00 | 1,96 | 0,20 |
| 3 | Земельный участок | Василишковский сельсовет, агрогородок Гурнофель, улица Социалистическая, 18 | 0,0074 | 425882704604000052 | 310,00 | 4,97 | 0,50 |

Земельный участок лот № 1 предоставляется в аренду, сроком на 10 лет, для установки и обслуживания торгового киоска.

Земельный участок лот № 2 предоставляется в аренду, сроком на 20 лет, для установки и обслуживания торгового павильона.

Земельный участок лот № 3 предоставляется в аренду, сроком на 20 лет, для установки и обслуживания торгового павильона с остановкой маршрутного транспорта.

Наличие возможности подключения к линии электроснабжения.

Аукцион состоится **20 марта 2018 г.** в **12.00**

по адресу: 231513 г. Щучин, пл. Свободы, 11 (здание Дома Советов, 2-й этаж, малый зал районного Совета Депутатов).

Заключительная регистрация участников аукциона

**20 марта 2018 г. с 8.00 до 12.00.**

1. Организатор аукциона – Щучинский районный исполнительный комитет, г. Щучин, пл. Свободы, 11;

контактные телефоны комиссии:

председатель **801514 27044**,

заместитель председателя и секретарь **801514 2 81 52**.

2. Прием заявлений и прилагаемых документов на участие в аукционе производится с **13 февраля 2018 г. по 14 марта 2018 г. включительно** с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 в рабочие дни, кабинет 54 землеустроительной службы райисполкома.

3. Для участия в аукционе гражданин, юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный в извещении срок подают заявление об участии в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые они желают приобрести в аренду, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка, а также заключают с местным исполнительным комитетом или по его поручению с организацией соглашение.

Кроме того, в комиссию или организацию представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

Консолидированными участниками для участия в аукционе представляются также оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию или организацию в указанные в извещении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие задаток (задатки) в размере, порядке и сроки, определенные в извещении, а также заключившие соглашение.

4. **Сумма задатка перечисляется на расчетный счет организатора аукциона** BY29AKBB36045270000164000000 ЦБУ № 424 филиала № 400 Гродненского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY21400, г. Щучин, **получатель – Щучинский районный исполнительный комитет, УНП 500066573.**

5. Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся внести плату за право заключения договора аренды земельного участка и возместить затраты, связанные с проведением аукциона и подготовкой документации, необходимой для его проведения.

6. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи, а также с условиями, предъявляемыми к проектному решению сооружения, которое будет размещаться на предоставляемом земельном участке.

7. Победителю аукциона или единственному участнику несостоявшегося аукциона может быть предоставлена рассрочка внесения платы, согласно действующему законодательству.

## Извещение о проведении открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность в городе Щучине и Щучинском районе

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта в Щучинском районе | Площадь земельного участка, га | Кадастровый номер | Стоимость затрат на изготовление документации, руб. | Начальная цена продажи, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Земельный участок | Город Щучин, квартал индивидуальной жилой застройки в районе улиц Ленина-Садовая, У – 1388 | 0,1076 | 425850100002000959 | 1102,40 | 9 912,89 | 991,29 |
| 2 | Земельный участок | Город Щучин, улица Мележа, 26 | 0,1500 | 425850100004000155 | 51,06 | 8517,80 | 851,78 |
| 3 | Земельный участок | Город Щучин, улица Мележа, 30 | 0,1500 | 425850100004000154 | 51,06 | 8517,80 | 851,78 |
| 4 | Земельный участок | Орлевский сельсовет, д. Турейск, 49А | 0,1502 | 425885309614000016 | 1210,87 | 373,67 | 37,37 |

Земельные участки предоставляются в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома.

Наличие возможности подключения к линии электроснабжения, к сетям водоснабжения и газоснабжения по лотам № 1, 2 и 3.

Наличие возможности подключения к линии электроснабжения по лоту № 4.

Аукцион состоится **20 марта 2018 г.** в **12.30**

по адресу: 231513 г. Щучин, пл. Свободы, 11 (здание Дома Советов, 2-й этаж, малый зал районного Совета Депутатов).

Заключительная регистрация участников аукциона

**20 марта 2018 г. с 8.00 до 12.00.**

1. Организатор аукциона – Щучинский районный исполнительный комитет, г. Щучин, пл. Свободы, 11;

контактные телефоны комиссии:

председатель **801514 27044**,

заместитель председателя и секретарь **801514 2 81 52**.

2. Прием заявлений и прилагаемых документов на участие в аукционе производится с **13 февраля 2018 г. по 14 марта 2018 г. включительно** с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 в рабочие дни, кабинет 54 землеустроительной службы райисполкома.

3. Для участия в аукционе гражданин, юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный в извещении срок подают заявление об участии в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые они желают приобрести в частную собственность, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка, а также заключают с местным исполнительным комитетом или по его поручению с организацией соглашение.

Кроме того, в комиссию или организацию представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

Консолидированными участниками для участия в аукционе представляются также оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию или организацию в указанные в извещении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие задаток (задатки) в размере, порядке и сроки, определенные в извещении, а также заключившие соглашение.

Граждане, юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

4. **Сумма задатка перечисляется на расчетный счет организатора аукциона** BY29AKBB36045270000164000000 ЦБУ № 424 филиала № 400 Гродненского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY21400, г. Щучин, **получатель – Щучинский районный исполнительный комитет, УНП 500066573.**

5. Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся внести плату за выкуп земельного участка в частную собственность и возместить затраты, связанные с проведением аукциона и подготовкой документации, необходимой для его проведения.

6. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи, а также с условиями, предъявляемыми к проектным решениям зданий и сооружений, которые будут размещаться на предоставляемых земельных участках.

7. Победителю аукциона или единственному участнику несостоявшегося аукциона может быть предоставлена рассрочка внесения платы, согласно действующему законодательству.

# ЯК КІРАВАЦЬ ДРЭВАМ?

## ВЕСНАВАЯ АБРЭЗКА Ў САДЗЕ

**Часам праца ў садзе нагадвае сапраўднае чараўніцтва. Чалавек можа задаваць дрэвам розную форму, кіраваць ураджаем і нават запускаць роставыя працэсы: напрыклад, сваім умяшаннем «нарасціць» галінак там, дзе было гола. Мала хто ведае, што на парастках акрамя бачных пупышак ёсць і так званыя спячыя, якія пры стымуляцыі могуць «выстраліць», здавалася б, на пустым месцы. Але перш чым выбірацца ў сад з секатарам, не пашкодзіла б паболей даведацца пра біялагічныя законы, звязаныя з ростам пладовых дрэў. Дарэчы, карысныя парады садаводы-аматары могуць атрымаць ад вучоных Інстытута пладаводства НАН Беларусі — па суботах для ўсіх ахвотных праводзіцца вучоба (сачыце за абвесткамі на сайце ўстановы), падчас якой вы ў тым ліку трапіце на практычныя заняткі ў садзе. Тут вы на сваё вочы ўбачыце, якія галінкі і на якую даўжыню варта абразаць, даведаецеся, як дрэва можа адрэагаваць на вашы дзеянні і як паступова задаваць форму кроне.**

Асобныя сакрэты, звязаныя з абрэзкай саду, сёння чытачам «Звязды» раскрывае **вядучы навуковы супрацоўнік аддзела тэхналогіі пладаводства Надзея КАПІЧНІКАВА:**

— Сярод самых распаўсюджаных памылак садаводаў-аматараў можна назваць залішне кароткую абрэзку. Так, калі ад добра развітога аднагадовага парастка пакінуць маленькую частку, можна справакаваць рост некалькіх непатрэбных атожылкаў, што загушчае крону, і на наступны год давядзецца іх выразаць. Часам добра, каб на дрэве былі рознаўзроставыя галінкі. Некаторым садаводам можа падацца, што дробныя парасткі — лішнія. Але, калі такая галінка заканчваецца кветкавай пупышкай і яна перайшла ўжо ў перыяд плоданашэння, лепш пупышку не чапаць, яна ўжо не будзе перашкаджаць.

Трэба ведаць прыёмы, як абмяжоўваць дрэва ў росце. Так, калі мы бачым, што яно дасягнула патрэбнай вышыні, яго трэба паэтапна стрымліваць. А ў выніку няправільнай абрэзкі можна атрымаць ваўчковыя парасткі — цэлы лес побач з кальцавым зрэзам. Розныя сарты яблынь могуць патрабаваць свайго падыходу да абрэзкі. Калі ж вы будзеце працаваць з грушай, улічвайце, што ў такіх дрэў часта атрымліваецца сціснутая форма кроны, і таму, каб зрабіць яе больш аб'ёмнай, укарочванне аднагадовага прыросту заўсёды рабіце на знешнюю пупышку. Наогул, крона пладовых дрэў павінна быць празрыстая, каб святло трапляла не толькі на знешнія галінкі, але і ўсярэдзіну, тады на ўсім аб'ёме завязваюцца кветкавыя пупышкі.

***— І, напэўна, такія дрэвы менш пашкоджваюцца ў час навальніц, моцнага ветру?***

— Сапраўды, лішні аб'ём — высокая паруснасць, таму часцей за ўсё ветрам і выварочваюцца дрэвы з вялікай кронай. Калі ж яна празрыстая, вецер праскоквае, не ўпіраецца. Калі не абразаць сад, мы атрымліваем некіраваныя дрэвы, яны цягнуцца ўгору, галінавання няма. Аўксін, які ствараецца ў верхавінкавых пупышках галінак, узмацняе іх рост, але пры гэтым замаруджвае развіццё бакавых парасткаў. Калі ж мы ўкарочваем галінкі, пажыўныя рэчывы, якія рухаліся ўгору, лепш размяркоўваюцца.

Пры абрэзцы ў першую чаргу выдаляюцца пашкоджаныя, зламаныя галінкі, у абавязковым парадку — з ракавымі ранамі. Бывае, аднагадовы прырост сагнуты — расліны пашкоджаныя тлёй, медзяніцай, гэта пажадана выразаць, — такім чынам мы часткова пазбаўляемся ад шкоднікаў і ўзбуджальнікаў хвароб. Важна, каб рана была здаровая: на свежы зрэз шкоднікі не так садзяцца, як на «размачалены». І, канешне, раны ад абрэзкі памерам з 20-капеечную манетку ці больш пажадана замазаць садовым варам ці фарбай.

***— У адзін год на яблыні багата пладоў, у наступны — ёй няма чым нас парадаваць. Ці можам мы кіраваць ураджаем?***

— Ёсць сарты, якія пладаносяць рэгулярна, а ў некаторых — дакладна выяўленая перыядычнасць (напрыклад, Заслаўская). Абрэзка ў нейкай ступені рэгулюе плоданашэнне. Важна не дапускаць перагрузкі ўраджаем. Часам бываюць спрыяльныя ўмовы пры цвіценні, завязванне добрае, і нават усе плады могуць выспець нядрэннымі. Але дрэву трэба не толькі вырасціць яблычкі, але і закласці кветкавыя пупышкі на будучы год. Садаводам трэба ведаць, што пупышкі закладваюцца ў канцы чэрвеня — ліпені. Калі ж дрэва нагружана пладамі, яму можа не хапіць харчавання, і на наступны год, нават пры спрыяльных умовах, ураджаю можна не атрымаць. Між іншым, дрэва само здольнае скідваць лішнюю завязь. Пры чэрвеньскіх асыпаннях яму можна дапамагчы: лішнія плодзікі зрэзаць нажніцамі, таксама яны лёгка «сашчоўкваюцца» і проста пальцамі. Пажадана, каб адлегласць паміж яблычкамі была каля 20 сантыметраў. Дарэчы, такім чынам мы працуем і на якасць ураджаю — зможам атрымаць больш буйныя плады.




Праца з парасткамі ў першы і другі год.



Ураджай залежыць ад размяшчэння галінак.

***— Гэтай зімой было шмат адліг, а калі падмарожвала, не хапала снегу. Ці магло гэта адбіцца на садзе?***

— Пакуль мы не апасаемся за сад. У мінулым годзе былі правакацыі, зваротныя халады, падмерзлі костачкавыя. Найбольш небяспечныя маразы ў сакавіку, асабліва пасля таго, як плюсавая тэмпература (5-8 градусаў) трымалася 5-7 дзён. Ёсць спосаб, які дапамажа крыху адцягнуць вегетацыю. Калі пачынае агаляцца зямля, трэба старацца згрэбці снег бліжэй да каранёвай сістэмы, каб пад дрэвам глеба як мага даўжэй не адтайвала. Часам так можна выйграць 3-4 дні. А бывае, што і адзін дзень можа быць крытычным.

***— І ўсё ж калі варта праводзіць абрэзку, а калі позна ёй займацца?***

— У аматараў яна праводзіцца ў канцы сакавіка — красавіку, калі дрэвы спяць. Калі ж пупышкі набухаюць, распускаюцца, выцягваючы абрэзаныя галінкі, садавод можа іх пашкодзіць. А наогул абразаць дрэвы ніколі не позна, мы гэта робім круглы год. Напрыклад, для таго каб стрымаць сілу росту, практыкуецца «папраўка» пасля цвіцення. Калі ўсе актыўныя аўксіны перабраліся ў верхнюю частку парастка, верхавінную пупышку можна зрэзаць, і тады дрэва не так моцна расце. Таксама мы праводзім «зялёныя аперацыі» з пачатку чэрвеня, калі парасткі выраслі з пачак запалак ці крыху болей (сантыметраў 10—12). Часам заўважана, што ідзе 3-4 атожылкі, а нам столькі не патрэбна для фарміравання кроны, лішнія выломваюцца зялёнымі, у выніку той адзін, які пакідаецца, будзе лепей расці.

***— Ці можна стары запушчаны сад, які ніколі не абразаўся, зрабіць прыгожым, дагледжаным?***

— У нас ёсць сад 1964 года пасадкі, мы трымаем яго невысокім, каб можна было з лесвіцай збіраць плады. У старым садзе можна рабіць амалоджванне ўсёй кроны. З вялікай колькасці галінак, якія прыкладна аднолькавыя па сіле росту, трэба прыбраць тыя, што перашкаджаюць. Асобныя галінкі можам перавесці на бакавыя адгалінаванні. Канешне, нельга зразаць адразу вельмі многа. Для таго каб карані добра развіваліся, ім патрэбна арганічнае рэчыва, якое сінтэзуюць лісты. І, зразумела, у першы год абрэзкі мы адразу не дасягнем таго эфекта, якога хацелася б, але ўжо атрымаем парасткі, з якімі пасля будзем працаваць як з пладаноснымі.

Акрамя таго, у садзе, які не старэйшы за 15 гадоў, можна перапрышчапіць яблыні. Гэта робіцца вясной. Зараз садаводы практыкуюць, калі на адным дрэве прышчэпліваецца некалькі сартоў, але пажадана, каб яны былі аднаго тэрміну выспявання, — раптам спатрэбіцца пазмагацца са шкоднікам. Бо ёсць такія сарты, што выспяваюць у жніўні, і такія, дзе плады здымаюцца ў канцы верасня.

***— У апошні час набыла папулярнасць верацёнападобная форма кроны, з чым гэта звязана?***

— Раней ураджаю мы чакалі на 8-9 год пасля пасадкі, і, канешне, за гэты час дрэву можна было нарасціць крону, што і рабілі. Сучасныя сарты сталі хуткаплоднымі, часам саджанцы цвітуць яшчэ ў гадавальніку. Тут трэба фарміраваць крону так, каб атрымліваць ураджай з самага пачатку. Калі мы абразаем дрэва, выклікаем дадатковы рост, таму што парушаны суадносіны паміж надземнай часткай і каранёвай сістэмай, а вось развіццё, якое характарызуецца плоданашэннем, пры гэтым крыху адцягваецца. Пры верацёнападобнай кроне практычна ўсе галінкі пакідаюцца, трэба толькі пазбягаць сітуацый, калі яны растуць вельмі шчыльна ці фарміруецца вострыя вугал, і сачыць, каб не было канкурэнта цэнтральнага праваднікa. Паколькі нам трэба асвятленне на ўсю крону, таму мы фарміруем яе так, што знізу яна шырэйшая, а да верху паступова звужаецца.

***— Мяняюцца і схемы пасадкі...***

— Раней вырошчвалі на семявой прышчэпе, а сёння з'явіліся клонавыя, якія па сіле росту бываюць суперкарлікавыя, карлікавыя, паўкарлікавыя. Селекцыянеры ствараюць сарты, але падвой можа паўплываць на іх сілу росту. Задача нашага аддзела вызначыць аптымальную схему пасадкі для кожнай сортападвойнай камбінацыі. І сёння ў радзе паміж дрэвамі можа быць метр-паўтара, а паміж радамі — 3,5-4 метры. Ужо ствараюцца цэлыя пладовыя сцэны. Зразумела, гэта ўплывае і на фарміраванне дрэў. У сучасных садах абрэзкай мы задаём аптымальную форму кроны для нашых канкрэтных умоў. Так і ў садаводаў-аматараў: калі ўчастак невялікі, ім трэба пастарацца «запіхнуць» яблыню ў пэўную прастору. Пры жаданні можна «расцягнуць» дрэва ўздоўж агароджы ці дарожкі, задаць яму любую форму, нават «зігзаг». Наогул дрэва добра падпарадкоўваецца. Напрыклад, калі ўсе галінкі на ім раслі ў адзін бок, мы можам асобныя з іх накіраваць туды, куды нам трэба: прывязаць да коліка ў патрэбным кірунку, выкарыстаць прыём з пераводам на пупышку, абрэзкай выклікаць рост маладых атожылкаў.



Задаваць форму дрэву можна і пры дапамозе адгібанняў шпагатам.

**Карысныя парады садаводы-аматары могуць атрымаць ад вучоных Інстытута пладаводства НАН Беларусі — па суботах для ўсіх ахвотных праводзіцца вучоба (сачыце за абвесткамі на сайце ўстановы), падчас якой вы ў тым ліку трапіце на практычныя заняткі ў садзе.**

***— Атрымліваецца, крону можна змяняць не толькі абрэзкай, але і фізічным уздзеяннем?***

— Так, можна рабіць расцяжку, прывязваць галінкі шпагатам, выкарыстоўваць грузікі ці разнастайныя іншыя прыстасаванні, нахіляць да шпалеры. На травяністых атожылках могуць спатрэбіцца і прышчэпкі. Дарэчы, ад нахілу залежыць утварэнне пладоў. Так, галінкі, размешчаныя гарызантальна, хутчэй уступаюць у плоданашэнне, а вертыкальныя імкнуцца да росту.

***— Як вызначыцца з вышынёй дрэва?***

— Галоўнае, каб вам было зручна. Калі ў гаспадарцы ёсць лесвіца, плодаздымальнік, — дрэва можа быць і да чатырох метраў. А вось рабіць яго вышэйшым няма сэнсу. Паспрабуй яшчэ адтуль дастаць яблык — яго можна толькі стрэсці, але пашкоджаныя плады не будуць захоўвацца.

***— Што садаводу яшчэ трэба рабіць ранняй вясной?***

— У абавязковым парадку трэба пабяліць дрэвы. На сонейку кара ўдзень награваецца, а ўначы — наадварот, на дрэвах могуць з'явіцца трэшчыны. Калі ж дрэва пабелена, сонца на яго не так уздзейнічае. А вось першыя апрацоўкі ад шкоднікаў праводзяцца ў красавіку, калі сярэднесутачная тэмпература стабільна пераходзіць за плюс пяць, ідзе набуханне пупышак, вылазяць казюлькі, развіваецца парша. Пры нізкіх тэмпературах прэпараты не працуюць. Наогул, чытайце інфармацыю на этыкетках, там прапісаны ўсе рэгламенты.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

■ Краіна прыгажунь

# НАРОДНЫЯ СПЕВЫ І «ПОДКУП» ХЛЕБАМ

## Як у сталіцы праходзіў кастынг «Міс Беларусь»

**«Падлога не слізкая? Толькі б не ўпасці», — хвалююцца дзяўчаты ў чаканні дэфіле. У гэтыя выхадныя ў Нацыянальнай школе прыгажосці не спыняўся цокат абцасаў — тут праходзіў кастынг конкурсу «Міс Беларусь — 2018». Як удзельніцы адбору раслі на вачах (у прамым сэнсе), каму прапанаваў работу алімпійскі чэмпіён і ці ёсць шанцы на карону ў «пышак» — у рэпартажы «Звязды».**



Сталіца стала апошнім горадам адбору прыгажунь. Дагэтуль кастынгі прайшлі ў абласных цэнтрах, куды з'ехалася каля 400 дзяўчат. Больш за ўсё ўдзельніц было ў Брэсце і Гродне, дзе адборы праводзіліся пазней.

Узрост ад 18 да 24 гадоў, без татуіровак і пірсінгу на целе, не замужам (і не ў разводзе!), без дзяцей — вось крытэрыі, якім неабходна адпавядаць, каб трапіць на конкурс. Перш чым прапусціць дзяўчат дэфіліраваць перад адборачнай камісіяй, ім мераюць рост — ён павінен быць не менш за 174 сантыметры.

— Пакуль з-за гэтага нікога не развярнулі. Даём шанц усім, — прызнаецца мужчына, які сустракае патэнцыйных «міс» каля раставера.

Некаторыя спрабуюць хітраваць і здавацца вышэйшымі. Адна з удзельніц незаўважна ўстала на пальчыкі. Але ўсё роўна не дацягнула да мінімальнай планкі. «Ну дабаўце мне сантыметр», — упрошвала, падключыўшы ўсю сваю чароўнасць.



Многія дзяўчаты адзеліся для кастынгу ў чорнае — выглядаць больш зграбнай лішнім не будзе. І, бадай, кожная прыхапіла з сабой туфлі на высокіх абцасах: без іх на конкурсе прыгажосці — як на экзамене без заліковкі. Хвалююцца, фарбуюцца, рэпеціруюць, што сказаць.

20-гадовая Ангеліна — адна з першых, хто пачуў на сталічным кастынгу «так». «Ногі яшчэ крыху дрыжаць», — усміхаецца дзяўчына. У шаснаццаць яна скончыла мадэльную школу, а цяпер працуе цырульнікам. Пайсці на конкурс падахвоцілі калегі. «Загадзя не рыхтавалася, проста расказала пра сябе», — дзеліцца мінчанка.

А вось іншая ўдзельніца Карына спецыяльна для конкурсу пахудзела. «За месяц скінула шэсць кілаграмаў і на гэтым не збіраюся спыняцца», — заяўляе. Разам з тым дзяўчыне падабаецца гатаваць. «Чамусьці цяпер гэта не цэніцца, — дзівіцца яна. — Любімая страва? Мачанка з блінамі. Але гэта да таго, як пачала худзець».

Быць толькі прыгажуняй тут мала. Удзельніц чакаюць пытанні ад адборачнай камісіі. Бландзінку Наталлю, якая вучыцца на арт-менеджара, вырашылі праверыць на веданне будучай прафесіі.

— Хто з маладых беларускіх артыстаў варты таго, каб яго прасоўвала прафесійна? — спытаў **дырэктар дырэкцыі спецыяльных праектаў Другога нацыянальнага тэлеканала Іван ПАДРЭЗ.**

— Іх шмат. Напрыклад, Аляксей Грос, — хутка сарыентавалася дзяўчына і заслужыла месца ў наступным этапе.

Настаўніцу рускай мовы і літаратуры Юлію папрасілі паразважаць над праблемай: як цяперашняе пакаленне, якое не прывыкла да вялікіх тэкстаў, заахвоціць чытаць раманы? «Можна паказваць трэйлеры да фільмаў, знятых па гэтых творах, каб заінтрыгаваць», — прапанавала арыгінальны падыход маладых педагог.

Увогуле, на кастынг прыйшлі прадстаўніцы розных прафесій. Інжынер-тэхнолаг, выхавальніца ў дзіцячым садку, урач-акушэр, эканаміст, індывідуальная прадпрымальніца...

— Я працую рабочай на Барысаўскім заводзе медпрэпаратаў, — прадстаўляе сябе Кацярына. — Яшчэ раблю манікюр сяброўкам і сябрам.







Бачачы, што камісія вагаецца, прапануе паказаць свае карціны. Не дапамагло: падвяло дэфіле.

— Засмуцілася? — цікавімся ў дзяўчыны на выхадзе.

— Ды не. Я прыехала проста паспрабаваць, ні на што асабліва не разлічвала.

— На наступны конкурс прыйдзеш?

— Не ведаю. Магчыма, праз два гады ў мяне ўжо будуць муж і дзеці.

18-гадовая Марыя марыць звязаць сваё жыццё з творчасцю. Хоча паступаць у акадэмію мастацтваў. Іван Падрэз прапануе ёй уявіць, што яна на экзамене, і прачытаць што-небудзь на памяць. Дзяўчына не разгубілася: адкінула назад доўгія валасы і пранікнёна расказала верш.

— Які ў вас рост?

— 170... Але я расту! Раблю спецыяльныя практыкаванні, дастаткова сплю.

— Добра. У якасці выключэння запрашаем вас у наступны тур. Рыхтуйцеся да дэфіле ў купальніках, — дазволіла камісія.

Каб запомніцца, прыгажуні стараліся здзівіць. Баксіравалі, жангліравалі, спявалі народныя песні. А інжынер-мікрабіёлаг хлебазавода Наталля вырашыла «падкупіць» — вынесла кошык з прадукцыяй свайго прадпрыемства. «Які хлеб лепш купляць?» — пацікавілася камісія. «Толькі нашага завода!» — бойка адказала дзяўчына. Мы пасля спыталі ў зграбнай Наталлі: ці лёгка захоўваць фігуру, працуючы побач з выпечкай? «Вельмі цяжка. Там такія пахі! — уздыхае. — Я люблю слоеныя піражныя. Даводзіцца хадзіць у трэнажорную залу па тры-чатыры разы на тыдзень, каб быць у форме».

На кастынгу прысутнічалі прадстаўнікі мадэльных агенцтваў, таму некаторыя дзяўчаты атрымалі запрашэнне не толькі ў наступны этап, але яшчэ і на работу. А адной з удзельніц, бухгалтару па адукацыі, працоўнае месца прапанаваў **алімпійскі чэмпіён Аляксандр БАГДАНОВІЧ,** які сядзеў у камісіі, — ён якраз шукаў адпаведнага спецыяліста. Пытаемся ў яго, ці вырастаюць шанцы ўдала прайсці кастынг, калі дзяўчына — спартсменка. «Не. На конкурсе прыгажосці трэба пастаянна ўсміхацца, быць артыстычным, а спартсмены звычайна сарамеюцца. Ёсць шмат прыгожых і добрых дзяўчат, але для фармату шоу яны не падыходзяць», — падзяліўся меркаваннем чэмпіён.

Галоўнае пытанне: каго шукаюць?

— Самую прыгожую, разумную, светлую, годную, — адказвае **галоўны рэжысёр Другога нацыянальнага тэлеканала Анжаліна МІКУЛЬСКАЯ.** — Тую, бачачы якую думалі б: «Якая ж Беларусь цудоўная краіна!» Звяртаем увагу на дагледжанасць, выхаванасць, уменне падаць сябе. Будучая «міс» не павінна быць пустышкай.

***— Дзяўчаты на сёлетніх кастынгах адрозніваюцца ад тых, што былі 10 гадоў таму?***

— Так, яны больш свабодныя, многім цікавяцца — не толькі мадэлінгам. У адным з гарадоў была ўдзельніца, якая прадстаўляла дыпастыю электрыкаў. Хоць не ўсе карыстаюцца магчымасцямі, якія ў іх ёсць у маладосці. Вельмі сумна чуць, што хобі — гэта гуляць на камп'ютары. Англійскую мову часта не ведаюць, а яна патрэбная.

***— У «пышак» ёсць шанц трапіць на конкурс прыгажосці?***

— На адным з адбораў мы ўзялі паўнаватую дзяўчыну. Дамовіліся, што яна возьмецца за трэніроўкі і прывядзе сябе ў форму. Гэта будзе цікавы эксперымент. Але мы не прывязваемся жорстка да параметраў 90-60-90: важная гармонія.

Па словах Анжаліны Мікульскай, пастаяннага лідара сярод рэгіёнаў па «пастаўцы» прыгажунь няма. Кожны раз гэта розныя вобласці.

На кастынг у Мінску прыйшло 400 чалавек. У фінальным шоу прымуць удзел толькі каля 30 дзяўчат з усёй краіны. Пераможца, акрамя кароны і права прадстаўляць Беларусь на міжнародных конкурсах прыгажосці, атрымае буйны грашовы прыз і аўтамабіль Geely Atlas. Фінал «Міс Беларусь» пройдзе 4 мая ў сталічным Палацы спорту.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ** ■

## Яўген КАРАЛЁК:

# «У веласпорце трэба быць працавіком»



### Кароль скрэтча расказвае пра перамогу ў Мінску і планы на чэмпіянат свету ў Галандыі, які стартуе 28 лютага

**У студзені Мінск прыняў этап Кубка свету па веласпорце на трэку. Адзіны медаль для беларускай зборнай заваяваў Яўген Каралёк, ён стаў найлепшым у скрэтчы. Поспехаў у гэтай дысцыпліне велагоншчык ужо дамагаўся на аналагічным турніры ў Лос-Анжэлесе летась і на чэмпіянаце Еўропы ў Партугаліі. Цяперашняя выдатная форма Яўгена выклікае аптымізм асабліва зараз, калі да чэмпіянату свету застаецца каля двух тыдняў. Пра свае планы на планетарнае першынство, жорсткі допінг-кантроль і бяспеку ў велагонках на шашы Каралёк расказаў у інтэрв'ю «Звяздзе».**

***— Яўген, ці чакалі, што выйграеце «золата» ў Мінску?***

— Я максімаліст, разлічваў на медаль, таму што ўжо дасягаў поспехаў у падобных гонках. Да таго ж прарабіў вялікую працу: увесь снежань трэніраваўся на Кіпры, у студзені правёў гонкі на чэмпіянаце Расіі, прыехаў на этап Кубка свету ў Мінск у вельмі добрай форме.

***— Ці справіліся нашы суайчыннікі з арганізацыяй такога буйнога турніру?***

— Так, усё было на самым вышэйшым узроўні, ніякіх нюансаў. Бачыў розныя відэаролікі, дзе і замежныя спартсмены пакідалі свае станоўчыя водгукі.

***— Мінулы год стаў для вас досыць паспяховым, і цяперашні пачаўся з перамогі.***

— Так, летам 2017-га я выйграў Гран-пры Мінска на шашы, перамагаў і на трэку (этап Кубка свету і чэмпіянат Еўропы). Рады, што 2018-ы пачаўся на такой жа пазітыўнай хвалі, бо наперадзе чэмпіянат свету ў Галандыі.

***— Ці задаволены формай, у якой падыходзіце да яго?***

— Так, адчуваю сябе выдатна. Увогуле кажучы, засталося ўсяго два тыдні — гэта вельмі маленькі прамежак часу, за яго асабліва не падрыхтавацца, што ёсць, тое ёсць. Цяпер у мяне заканчваецца збор у Турцыі, потым прыеду ў Мінск пакатацца пару дзён на трэку і адпраўлюся ў Галандыю. Зразумела, буду выступаць у скрэтчы, калі ў нашай каманды атрымаецца трапіць у мэдысан, тады і ў гэтай дысцыпліне.

Сярод лідараў на чэмпіянаце будуць аўстралійцы, брытанцы, бельгійцы, датчане. Многія краіны зараз сур'ёзна дадалі, нават калі меркаваць па сярэдніх хуткасцях, гэта відаць. Гады тры таму веласіпедысты паказвалі 50—52 км/г, цяпер — 55—57 км/г. Канкурэнцыя расце.

***— Якія задачы стаяць перад вамі на чэмпіянаце свету?***

— Імкнуся выконваць кантракт, заключаны з Мінспортам, там прапісана шостае — дзясятае месца, але я, вядома, еду ў Галандыю па медалі. Ужо выйграваў чэмпіянат Еўропы, Кубак свету, не хапае толькі перамогі на планетарным першынстве.

***— У свеце распаўсюджана практыка, калі велагоншчык выступае і на шашы, і на трэку?***

— Так, часам адно не можа быць без другога: каб ганяцца на трэку, неабходна практыка на шашы. Горныя трэніроўкі дазваляюць пракачаць сілу, цягавітасць, а на трэку развівацца хуткасць.

Калі казаць пра адрозненні на спаборніцтвах, то на трэку гонкі больш кароткія па часе, але вельмі хуткасныя. 30 хвілін ты працуеш на мяжы сваіх магчымасцяў. На шашы можаш ехаць 4 гадзіны, за гэты час і вады пап'еш, і паясі,




і своечасова збярэшся на фініш. Мне больш падабаецца трэк, гэта мая асноўная спецыялізацыя, але зараз вялікі акцэнт раблю на шашы, таму што ў будучыні хацелася б трапіць у прафесійны клуб. «Мінск» — гэта кантынентальны клуб, вельмі добра, што ён наогул ёсць у Беларусі, гэта вялікая перспектыва для спартсменаў і ў прыватнасці для мяне. Выступленні за яго — шанц паказаць сябе на гонках еўрапейскага календара, зарэкамендаваць, каб цябе заўважылі і прапанавалі кантракт з пратураўскім клубам.

***— Па ходзе шашэйных гонак заўважаеце, што адбываецца вакол?***

— Гэта залежыць ад таго, які ход гонкі, калі нейкія вырашальныя моманты, то ўвогуле нічога навокал не бачыш, а калі пелатон адпусціў ў адрыў, а група коціцца, можна трохі расслабіцца, зладзіць перакус і паназіраць за горнымі пейзажамі.

***— Ёсць краіна, дзе выступаць падабаецца больш за ўсё?***

— На шашы ў мяне больш раўнінная спецыялізацыя, таму мне падабаюцца краіны менавіта з такім рэльефам.

***— Ці здараліся нестандартныя сітуацыі падчас гонак?***

— Бывала. Напрыклад, ідзе гонка, група гоншчыкаў з'язджае ў адрыў, і тут чыгуначны пераезд, лідары праскочылі, а астатняя група не паспявае, шлагбаум зачыняецца. Прыходзіцца чакаць, пакуль праедзе цягнік. Праўда, правілы рэгулююць такія сітуацыі, усіх велагоншчыкаў тармозяць, пакуль удзел не зможгуць працягваць усе спартсмены. А наогул, усяго хапала, можа і сабака які-небудзь выскачыць пад колы, на зборы ў Арменіі сустрэлі цэлы статак парасят.

***— Важна сачыць за ўласнай бяспекай на шашы?***

— Вядома, небяспека на дарозе прысутнічае заўсёды, на спаборніцтвах велагоншчыкаў суправаджае міліцыя на машынах і матацыклах, а вось калі трэніруешся на шашы сам, трэба быць вельмі ўважлівым, трымацца на адлегласці метра ад абочыны і выконваць іншыя правілы, бо сумных выпадкаў было ўжо вельмі многа.

***— Што б вы назвалі самым галоўным у веласпорце?***

— Тут трэба быць працавіком і любіць тое, што робіш. Мне неяк з самага дзяцінства спадабаўся гэты від спорту. Трэнер прыйшоў у школу набіраць дзяцей у секцыю, спачатку туды пайшоў мой малодшы брат, праз дзень з'явіўся і я. Усё неяк адразу стала складвацца, спачатку ў Гродне (там я нарадзіўся) пачаў перамагаць на гарадскіх спаборніцтвах, потым на рэспубліканскіх, гэта надавала мне сіл і матывацыі, хацелася ўсё больш працаваць.

***— З Гродна ў нас ёсць яшчэ адзін вядомы спартсмен з такім жа прозвішчам — гандбаліст Арцём Каралёк...***

— Так, гэта мой стрыечны брат, сачу за гандболам, глядзеў студзеньскі чэмпіянат Еўропы, сумна, што хлопцы часта прайгравалі.

***— Вернемся да веласпорту, ён траўманебяспечны?***

— Вядома, калі група нясецца, можна чакаць усяго: хтосьці за кагосьці зачапіўся, і пачынаюцца падзенні, ад гэтага, вядома, траўмы. Мяне яны таксама не абышлі, сінякі — гэта дробязі, звыкла, а вось неяк узнікла праблема з каленам з-за таго, што няўдала ўпаў. Там сабралася вадкасць, прыйшлося выпампоўваць, дзякуй богу, усё абышлося.

***— Якую перамогу назавяце самай значнай у вашай кар'еры?***

— Гэта нават не перамога, а трэцяе месца на чэмпіянаце Еўропы ў 2015 годзе ў каманднай гонцы. Летась я ехаў на гэты турнір ужо мэтанакіравана па медаль, а тады гэта было нечакана. Хоць і ў 2017-м не мог паверыць у сваю перамогу, пакуль не ўручылі майку чэмпіёна, у якой па традыцыі трэба спаць. Было вельмі прыемна.

***— Як звычайна строіцца ваш дзень?***

— Свой асноўны час я праводжу на зборах за мяжой, рыхтуюся да гонак. Прачынаюся, на галодны страўнік іду на зарадку альбо на расцяжку да мора. Снедаю за дзве гадзіны да пачатку заняткаў і каля 10 гадзін выязджаю на трэніроўку, якая доўжыцца ад 4 да 6 гадзін на шашы. Вяртаюся бліжэй да вечара, вячэраю і кладуся спаць. У дзень адпачынку імкнуся выехаць у горад, пасядзець дзе-небудзь у кафэ і адпачыць маральна.

***— Трэніроўкі атрымліваюцца досыць энергазатратныя.***

— Так, таму бяру з сабой ежу, гэта звычайна батончыкі мюслі, зефір ці булачкі з джэмам, якія я гатую сам. Ёсць яшчэ спецыяльныя гелі, якімі зручна харчавацца ў дарозе, але я не бачу ў іх сэнсу, булачка засвойваецца даўжэй і дае больш энергіі.

***— Допінгавыя скандалы сёння — адна з самых важных тэм у спорце, а пачалія яны менавіта з веласпорту.***

— Так, з Лэнса Армстранга, сяміразовага пераможцы «Тур дэ Франс», легенды веласпорту, які быў злоўлены на допінгу. Я спакойна да гэтага стаўлюся, упэўнены ў сабе і ў сваім лекары. На Кубку свету ў Мінску здаваў тэст два разы на дзень — да старту гонкі і пасля перамогі. Прадстаўнікі антыдопінгавага кантролю могуць прыехаць да мяне дадому ў любы час. У адпаведныя службы спартсмен аддае план сваіх збораў, спаборніцтваў і гэтак далей для таго, каб яны былі ў курсе, дзе і ў які час знаходзіцца атлет. Напрыклад, калі я прачынаюся ў 7 раніцы, ведаю, што з 7 да 8 павінен быць дома, таму што могуць прыехаць і праверыць мяне. Спецыялісты антыдопінгавай службы робяць гэта, вядома, без папярэджання і ў любы дзень, напрыклад, за мінулы год да мяне дадому прыязджалі 7 разоў, я здаў 14 проб. Гэта шмат.

## ■ Хроніка

# Галава закружылася не толькі ў Сасновіч

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра матч Кубка Федэрацыі Беларусь — Германія, выступленне гандбольнага СКА ў розыгрышы Кубка ЕГФ і жаночай баскетбольнай зборнай у адборы на чэмпіянат Еўропы.**

**1. Жаночая тэнісная зборная прайграла камандзе Германіі з лікам 2:3 у чвэрцьфінальным матчы Кубка Федэрацыі.**

У першы дзень спаборніцтваў, 10 лютага, Арына Сабаленка ўзяла верх над Таццянай Марыяй, а затым Аляксандра Сасновіч саступіла Антоніі Лотнэр. Падчас матча Аляксандра адчула праблемы са здароўем, яна дайграла сустрэчу, але з адмоўным для каманды вынікам. Медыцынскае абследаванне пасля гульні пацвердзіла асцярогу ўсёй каманды ў тым, што Сасновіч не зможа дапамагчы тэнісісткам у нядзелю, таму капітан каманды Эдуард Дуброў зрабіў аператыўную замену Аляксандры на Веру Лапко.

У нядзелю маладая тэнісістка саступіла Таццяне Марыі, а потым Арына Сабаленка перайграла Антонію Лотнэр, пасля чаго лёс матча вырашыўся ў драматычнай парнай сустрэчы.

У ёй Арына Сабаленка і Лідзія Марозава ва ўпартай барацьбе саступілі нямецкаму дуэту Ганна-Лена Грэнефельд/Таццяна Марыя.

— *Наша задача цяпер вярнуцца ў І Сусветную групу, таму што наступны этап у красавіку ўжо будзе пераходны, за права застацца ў васьмёрцы наймацнейшых,* — падводзіць вынікі сустрэчы Эдуард Дуброў. — *Апошнім часам нам ледзь-ледзь чагосьці не хапае. У нас няма топавай пары, якая стабільна гуляе на турнірах. У цэлым я задаволены камандай! Калектыў наш мне падабаецца: згуртаваны, хоча гуляць, удасканальвацца, прагне перамог, ніхто не раскісае, а, наадварот, прымушае сябе працаваць далей, гатовы ўжо на наступным тыдні ехаць і гуляць на турніры.*

Зборная Германіі ў барацьбе за выхад у фінал згуляе з тэнісісткамі Чэхіі, якія ў 1/4 перайгралі ў Празе швейцарак з лікам 3:1. Яшчэ ў адным чвэрцьфінале француженкі адолелі на сваёй пляцоўцы бельгіек — 3:2. У паўфінале каманда Францыі згуляе са зборнай ЗША, якая перамагла ў сябе дома тэнісістак Нідэрландаў.

**2. Жаночая зборная краіны па баскетболе прайграла камандзе Турцыі ў заключным матчы першага круга кваліфікацыйнага раўнда чэмпіянату Еўропы — 54:64.** Самай выніковай у складзе беларусак аказалася натуралізаваная амерыканка Алекс Бэнтлі, якая набрала 12 ачкоў.

Наступны паядынак у кваліфікацыйнай групе В беларускія баскетбалісткі таксама правядуць на дамашняй пляцоўцы ў сталічным Палацы спорту. Заўтра іх сапернікам будзе зборная Польшчы, якая напярэдадні выйграла ў Таліне ў эстонак з лікам 87:68.

Нагадаем, на старце адборачнага турніру ў лістападзе 2017 года беларуская дружына перамагла полек — 70:62, а затым у Мінску разграміла сапернiц з Эстоніі з лікам 80:63.

**Становішча камандаў у групе В:** Турцыя — 6 ачкоў, Беларусь — 5, Польшча — 4, Эстонія — 3.

**3. Жаночая зборная Беларусі па індор-хакеі стала бронзавым прызёрам Кубка свету ў Берліне.** У матчы за трэцяе месца беларускі сустрэліся з саперніцамі з Украіны і дабіліся перамогі — 2:1.

Адзначым, што наша зборная ўпершыню стала бронзавым прызёрам Кубка свету, да гэтага найлепшым вынікам каманды было чацвёртае месца ў 2011 годзе ў Познані. Цяпер у сусветным рэйтынгу зборная Беларусі займае пятае месца.

**4. Гандбалісты мінскага СКА няўдала стартавалі ў групавым этапе розыгрышу Кубка ЕГФ.** У дамашнім паядынку першага тура спаборніцтваў армейцы саступілі нямецкаму «Магдэбургу» з лікам 31:33. Наступны матч СКА правядзе 17 лютага ў гасцях у славацкага «Татрана» з Прэшава

■

Матэрыялы падрыхтавала Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

## Управление принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома объявляет о проведении торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Оршанский райагросервис» (УНП 390287301)

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества и его стоимость | Лот № 1. Автомобиль «Шевроле Нива 212300-55», легковой джип, 2013 года выпуска, гос. номер 8391 ЕМ-2, № кузова/рамы X9L212300E0497915, с установленной начальной ценой 6 443 рубля. Лот № 2. Автомобиль «УАЗ 315196-035», легковой джип, 2012 года выпуска, гос. номер 5354 ЕМ-2, № кузова/рамы 315193C0007599, 315100C0532509, с установленной начальной ценой 3 265 рублей. Лот № 3. Автомобиль «Шевроле Нива 212300-55», легковой джип, 2012 года выпуска, гос. номер 8300ВМ-2, № кузова/рамы X9L212300C0409004, с установленной начальной ценой 5 794 рубля. Лот № 4. Автомобиль «Фольксваген Кэдди», грузовой специальный фургон, 2009 года выпуска, гос. номер AI9385-2, № кузова/рамы WV1ZZZ2KZAX064495, с установленной начальной ценой 5 700 рублей |
| Наличие обременений | Отсутствуют |
| Местонахождение имущества | г. Орша, ул. Ленина, 234а |
| Место, дата и время проведения торгов | 28.02.2018 г. в 11.00 г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 2.4 |
| Справочная информация об организаторе торгов | Управление принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома (г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1). Судебный исполнитель – Деревнин Сергей Евгеньевич, тел./факс (0212) 61 40 08, (033) 687 91 44. www.vitebskjust.gov.by |
| Условия и порядок проведения торгов | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано: 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет управления принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома IBAN BY73AKBB36429030010372000000 в ф-ле 200 ОАО «АСБ Беларусбанк», BICAKBBBY21200, УНП 300002505, не позднее 17.00 27.02.2018 г. Величина первого шага составляет 5 процентов начальной стоимости выставленного на торги имущества (лота). В соответствии со статьей 97 Закона Республики Беларусь «Об исполнительном производстве» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги (покупателем) |

**ВНИМАНИЕ!!!** УНП 400230163

**Коммунальное топографо-геодезическое унитарное предприятие «ГОМЕЛЬГЕОДЕЗЦЕНТР» в открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность в г. Гомеле №3-С/2018 на 28.02.2018 г., вносит следующие корректировки:**

1. Кадастровый номер 340100000007001783 изменить на 340100000007072538; 340100000007005927 на 340100000007072536.
2. По лоту № 2 – сумму 1 896 руб. 79 коп. изменить на 2 158 р. 64 коп.

**Контакты: +375 0232 41 97 86, сайт: www.geodezcentr.by либо qomel.qov.by**

Центр Промышленной Оценки
- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

| **Извещение о проведении повторного аукциона** | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | Унитарное предприятие «Кривичское РТП», Минская область, Мядельский р-н, г. п. Кривичи, ул. К. Маркса, 10 |
| **Предмет аукциона** | |
| **Лот № 1** | |
| **Здание магазина**, инв. номер 633/С-13414, общ. пл. 106,1 кв. м. Составные части и принадлежности: кирпичная пристройка, дощатый сарай, уборная. Адрес: Минская обл., **Мядельский р-н, Нарочский с/с, д. Швакшты, д. 1А** | |
| **Сведения о земельном участке:** предоставлен Продавцу пл. 0,0366 га на праве аренды сроком по 23.01.2113 для обслуживания здания магазина | |
| **Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 7 500,00 бел. руб.** | |
| **Лот №2** | |
| **Здание магазина**, инв. номер 633/С-13690, общ. пл. 164,9 кв. м. Составные части и принадлежности: блочная пристройка, кирпичная пристройка, блочный сарай. Адрес: Минская обл., **Мядельский р-н, Кривичский с/с, д. Парубки, пер. Первомайский, 1А** | |
| **Сведения о земельном участке**: предоставлен Продавцу пл. 0,1166 га на праве аренды сроком по 13.10.2113 для обслуживания здания магазина. Описание права, ограничения (обременения) прав: охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 В, площадь 0,0077 га | |
| **Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 17 000,00 бел. руб.** | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** рабочих дней после проведения аукциона |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by** | |
| Предыдущее извещение о проведении аукциона по лоту №1 опубликовано в газете **«Звязда» от 13.12.2017** | |
| **Аукцион состоится 06.03.2018 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703. Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 03.03.2018 до 17.00** по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by | |

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Стройтрест № 4» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже **изолированного помещения (наименование – Кабинеты)** инв. № 500/D-708148791 общей площадью **131,6 кв. м**, расположенного на первом этаже многоквартирного жилого дома по адресу: г. Минск, ул. Матусевича, 64-155 (далее – Объект).

**Начальная цена с НДС (20 %) – 370 422,22 бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены 37 042,00 бел. руб.) перечисляется на р/с в формате IBAN № BY55BPSB30121082600169330000, в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», BIC BPSBBY2X, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. **Возможно предоставление рассрочки оплаты за объект на 12 календарных месяцев** с внесением платежей в следующем порядке: оплата 40 % стоимости имущества должна быть произведена в течение 15 (пятнадцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, оплата оставшихся 60 % стоимости имущества – равными долями в течение 11 календарных месяцев.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 1 (один) процент от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущее извещение опубликовано в газете "Звязда" от 15.12.2017. Аукцион состоится **28.02.2018** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **27.02.2018** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 224-61-34, (8029) 102-21-17.**

## Открытое акционерное общество «Управление механизации № 79» извещает своих акционеров о проведении 16 марта 2018 года очередного общего собрания акционеров

***Повестка дня:***

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2017 году и основных направлениях деятельности Общества в 2018 году.
2. Отчет о работе наблюдательного совета в 2017 году. Оценка деятельности директора Общества наблюдательным советом.
3. Отчет ревизионной комиссии о результатах проверок финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2017 году.
4. Утверждение годового отчета и баланса Общества.
5. Утверждение порядка распределения чистой прибыли за 2017 год. О выплате дивидендов за 2017 год.
6. Утверждение плана распределения чистой прибыли общества на 2018 год. Периодичность выплаты дивидендов в 2018 году.
7. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
8. Утверждение условий материального вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

Место проведения собрания – г. Минск, ул. Селицкого, 27А, актовый зал.

Время начала проведения собрания – **15.00.**

Время регистрации участников собрания – в день проведения собрания с **13.00 до 14.45** по предъявлению документа, удостоверяющего личность, а представителей акционеров – и доверенности.

Время и место ознакомления акционерами с материалами по вопросам повестки дня собрания – в рабочие дни начиная с **23 февраля 2018 года** по месту нахождения Общества **с 13.00 до 17.00**, в день проведения собрания – по месту проведения собрания **до 13.00**.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра **на 7 февраля 2018 года**. УНП 100090613

## ОАО «Нафтан» реализует на конкурсной основе (с повышением начальной цены) бывшее в употреблении неиспользуемое имущество

| Наименование | Инв. № | Год выпуска | Начальная цена без НДС, руб. РБ | Начальная цена с НДС, руб. РБ |
|---|---|---|---|---|
| Вагон-цистерна, модель 15-1443 | 06151337 | 1985 | 6587,50 | 7905,00 |
| Вагон-цистерна, модель 15-1548 | 06256062 | 1990 | 6015,00 | 7218,00 |
| Вагон-цистерна, модель 15-1548 | 06256064 | 1990 | 6015,00 | 7218,00 |
| Автопогрузчик «Амкадор-451А» | 06269746 | 2006 | 15095,00 | 18114,00 |
| Полуприцеп-цистерна ППЦ 22 МАЗ 9919-012, гос. № В 0696 А | 13150716 | 2005 | 10930,00 | 13116,00 |

**Состояние удовлетворительное.**

Предложения принимаются по адресу: 211441, г. Новополоцк-1, ОАО «Нафтан», заводоуправление, каб. 101 до 9.30 по местному времени **15 марта 2018 года** с пометкой на конверте: «Реализация неликвидов, 15.03.2018 г.».

Извещение на проведение конкурса размещено на сайте www.naftan.by.

Контактные телефоны: 8(0214) 59-87-83, 8(0214) 59-89-26, 8(0214) 59-88-42, 8(0214) 59-88-01.

УНП 300042199

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» по поручению Заславского городского исполнительного комитета проводит повторный открытый аукцион по продаже **единого предмета аукциона** в составе:

**Право заключения договора аренды земельного участка для обслуживание зданий и сооружений гостиничного комплекса** с кадастровым номером 641500000001000893 площадью **13,1893 га**, расположенного по адресу: **г. Заславль, ул. Гонолес, 2А.** Земельный участок для обслуживания зданий и сооружений гостиничного комплекса будет передан в аренду сроком **на 30 лет. Ограничения прав в использовании** земельного участка: водоохранная зона Заславского водохранилища (13,1893 га), зона отдыха «Минское море» (13,1893 га).

**Не завершенные строительством незаконсервированные капитальные строения**, расположенные на земельном участке с кадастровым номером 641500000001000893 по адресу: г. Заславль, ул. Гонолес, 2А:

**водонапорная башня;**
**здание котельной** общ. пл. **433,9 кв. м**;
**трансформаторная подстанция** общ. пл. **12,8 кв. м**;
**гостиничный комплекс** (гостиничный комплекс с подвалом и мансардным этажом) общ. пл. **8 511,3 кв. м**;
**административное здание** (административное здание с подвалом и мансардным этажом, пристройка, терраса, площадка и ограждение) общ. пл. **507,2 кв. м;**
**здание нежилое № 1** (здание нежилое с подвалом) общ. пл.**281,4 кв. м;**
**здание нежилое № 2** (здание нежилое с подвалом) общ. пл.**285,7 кв. м;**
**здание нежилое № 3** (здание нежилое с подвалом) общ. пл.**386,0 кв. м;**
**здание нежилое № 4** (здание нежилое с подвалом) общ. пл.**462,1 кв. м;**
**здание нежилое № 5** (здание нежилое с подвалом) общ. пл.**453,1 кв. м;**
**здание нежилое № 6** (здание нежилое с подвалом) общ. пл.**375,8 кв. м;**
